Ніва

ТЫДНЁВІК ГП БГКТ

№ 19 (898) ГОД XVIII БЕЛАСТОК 13 МАЯ 1973 г. ЦАНА 60 гр.

ЛЮДЗІ ДОБРАЙ РАБОТЫ

Чыгуначнік Астанковіч — перадавы гаспадар



Васіль Астапковіч працуе на станцыі ў Чаромсе дыжурным руху. Службова ходзіць у чырвонай шапцы, адпраўляе і прымае паязды. Аднак...

— Ці не памыляюся, гэта вы Васіль Астапковіч? — пытаю сімпатычнага мужчыну ў чырвонай шапцы.

— Гэта я, — адказвае.

— Не ведаю, ці я добра папаў, бо мне патрэбны гаспадар Астапковіч, той, што у конкурсе „Беластоцкая вёска...“

Так распачалося маё знаёмства з перадавым гаспадаром-чыгуначнікам.

На чыгунцы В. Астапковіч працуе 29-ты год. Спачатку быў тэлеграфістам, а потым закончыў курсы для дзяжурных руху. Тэлеграфам зацікавіўся, калі быў яшчэ хлопцам, а ў іх мясцовасці сталі савецкія тэлеграфісты. У 1946 годзе, будучы ў арміі, працаваў радыётэлеграфістам.


— Дык што вас звязвае з сельскай гаспадаркай? — пытаюся,

— Я — гаспадарскі сын. Мой бацька меў гаспадарку, а зараз я працую на гаспадарцы жонкі (4,70 га). Зразумела, гэта гаспадарка не прадукцыйная, бо малая, і таму яна ў мяне лічыцца як доследная.

Астапковіч наладзіў сувязь з сельскагаспадарчым часопісам „Плён“. Дзякуючы гэтым кантактам пачаў атрымліваць найбольш сучасныя сарты насення пшаніцы. Ужо зараз можа сказаць, што найлепш на нашыя зямлі падыходзяць савецкія сарты, таму што яны найбольш мароза- і хваробаўстойлівыя. Пшаніца „міронаўская — 808“ выдала 40—41 цэнтнераў з гектара пры ўгнаенні 400 кг NPK. У гэтым годзе пасеяў пшаніцу „каўказ“, якая можа выдаць 60 цэнтнераў з гектара, а ў будучыні атрымае пшаніцу „аўрора“. Астапковіч рабіў таксама доследы з жытам „данькоўскім злотым“, якое выдала да 40 цэнтнераў, і з ячменем.

Астапковіч мае некалькі сваіх сказанняў. Адно з іх: „Каб нашую глебу давесці да парадку, дык можна яшчэ дзве Польшчы пабудаваць, а не адну“. Астапковіч мае права так гаварыць, таму што не вычытаў гэтага з кніжкі, але пераканаўся сам, сваімі рукамі, на сваім полі.

(Працяг на стар. 5)



ПОМНІК СТВАРАЛЬНІКУ ЭСПЕРАНТА

У Беластоку на скверыку непадалёку ад месца, дзе стаяў дом, у якім нарадзіўся і правёў дзіцячыя гады Людвік Заменгоф, пабудаваны помнік стваральніку міжнароднай мовы эсперанта. Адкрыццё помніка адбылося ў красавіку.

Фота Я. Цялушэцкага

ТАКІ ЎЖО ХАРАКТАР...



Сцяпана Бурылу — дырэктара пачатковай школы ў Маліnніках чакаць прыйшлося доўга. Якраз у той дзень аддзел асветы ППРН у Бельску праводзіў нараду аб арганізацыі новага 1973/74 навучальнага года. І толькі калі ўжо яскравае сакавіцкае сонца сыходзіла за небасхіл, на школьны панадворак уехалановенькая дырэктарская „сірэнка“. У апусцеўшых у гэтую пару, прасторных і добра абсталяваных класах цяпер завіхалася прыбіральшчыца, рыхтуючы іх да наступнага дня.

У Малінніках С. Бурыла працуе 16 год і вучыць ужо дзяцей сваіх былых выхаванкаў. Жыццё і асяроддзе ведае да найменшых драбніц. Таму і прынцып настаўніцкага калектыву, якім ён кіруе, нацэлены перш за ўсё на тое, каб выхоўваць маладое пакаленне на працавітых, старанных і адданых дзяржаве людзей. Гэтаму служаць школьныя арганізацыі Саюза польскага гарцэрства, Таварыства польска-савецкай дружбы, Польскага чырвонага крыжа, школьная ашчадная каса. Навучальны працэс у Малінніках імкнуцца індывідуалізаваць: працуючы з усім класам, вучняў слабейшых заахвочваць да больш грунтоўнага засваення матэрыялу, а вучнямі здольнымі спецыяльна апякуюцца і развіваюць у іх зацікаўленні.

Асаблівую ўвагу звяртае дырэкцыя маліннінскай школы на выбар васьмікласнікамі напрамкаў далейшай вучобы. Улічваючы здольнасці і схільнасці выпускнікоў, падказвае ім такія прафесіі, якіх патрабуе найбольш сучасная вёска і горад: гаспадароў з закончанай сельскагаспадарчай адукацыяй, будаўнікоў, механікаў, электрыкаў, гідраўлікаў. Самых здольных накіроўвае ў агульнаадукацыйныя ліцэі — перш за ўсё ў Агульнаадукацыйны ліцэй з беларускай мовай навучання ў Бельску.

Апрача мноства штодзённых школьных абавязкаў С. Бурыла знаходзіць час і на грамадскую працу. У гмінным камітэце ПАРП у Орлі ён з'яўляецца сакратаром прапаганды, кіруе таксама як старшыня гміннай прафесіянальнай настаўніцкай арганізацыяй, актыўна ўдзельнічае ў працы мясцовых армоўцаў і займаецца ў ёй справамі дзяцей і моладзі. У апошні час уключыўся ў пабудову ў Малінніках грамадскім чынам стражацкай рамізы.

— Усё пачалося з нашых размоваў на сельскіх сходах аб патрэбе для вёскі аб'екту, у якім знайшлося б месца на проціпажарныя прылады, залу на сходы, клуб „Руху“ або клуб селяніна, — расказвае С. Бурыла. — Ад

(Працяг на стар. 4)

ГАЙНАЎСКІ ПАВЕТ ВЯДЗЕ Ў ПАДПІСЦЫ „НІВЫ“

Ажыўленую дзейнасць праяўляюць працаўнікі поштаў Гайнаўскага павету ў распаўсюджванні „Нівы“. Гэта станоўчая з'ява, асабліва ўлічваючы спецыфіку гэтага рэгіёна. Амаль ва ўсіх поштах назіраем сістэматычны ўзрост паказчыка падпіскі на беларускі тыднёвік. Гэта стала магчымым дзякуючы поўнаму зразуменню пытання сярод адказных працаўнікоў акруговага паштовага ўпраўлення ў Гайнаўцы, начальнікаў і пісьманосцаў на месцах. Калі ў студзені гэтага года былі ў павеце 1934 падпісчыкі, дык у маі — 2453. Павялічылася, значыць, тут падпіска „Нівы“ на 519 экземпляраў.

Асабліва варта падкрэсліць працу паштовых працаўнікоў у Кляшчэлях, дзе падпіска „Нівы“ павялічылася на 67 экземпляраў, і ў Старым Ляўкове, дзе нашага тыднёвіка пабольшала на 49 экземпляраў. Падобнае становішча назіраем у Нараўцы, Клейніках і на многіх іншых поштах.

Не без значэння тут дзейнасць саміх пісьманосцаў. Яны ж маюць непасрэдную сувязь з чытачом. У падпісцы „Нівы“ вядуць Анатоль Манцюк з Кляшчэляў (60 экземпляраў) і Мікалай Лясота з Нараўкі (79 экземпляраў).

З гэтага факту робім вывады, што пры добрай ахвоце можна значна павялічыць падпіску „Нівы“. На нашу думку, яшчэ не ўсе магчымасці выкарыстаны ў гэтым напрамку. Нявыкарыстаныя рэзервы патэнцыяльных падпісчыкаў „Нівы“ можна знайсці яшчэ ў школах, дзе выкладаецца беларуская мова. „Ніва“ змяшчае матэрыялы, якія можна выкарыстаць пры навучанні роднай мовы. Апрача таго, тут друкуецца матэрыял, прысвечаны актуальным пытанням паўднёва-ўсходніх паветаў Беласточчыны.

Спадзяемся, што супольнымі намаганнямі дабёмся ў падпісцы „Нівы“ яшчэ лепшых вынікаў. І не толькі ў Гайнаўскім павеце.

М. Гогель

ПРАЗ ТЫДЗЕНЬ У „НІВЕ“

Культурная Гайнаўшчына ● Падставовая школа № 3 (беларуская) у Бельску ● Сустрэча з фальклорам (справаздача аб папулярна-навуковай сесіі ў Інстытуце рускай філалогіі Варшаўскага універсітэта, прысвечанай беларускаму фальклору) ● Аб супрасльскай сасне ● Актывісты ад хваста ● Людзі, пра якіх трэба ведаць ● Крах аперацыі „Цыклон“ (новая аповесць у адрэзках) ● Весткі з Нараўкі, Дубіч Царкоўных, Белавежы і Сакольшчыны ● Песня „Баллада о красках“ (рускі тэкст).

БГКТ ХРОНІКА

■ Нядаўна ў Бельску адбыліся павятовыя элімінацыі XIV міжшкольнага конкурсу на найлепшы беларускі тэатральны калектыў. Прынялі ў іх удзел самадзейнікі з наступных падставовых школ: з Аўгустова, Храбалоў, Дубяжына, Галадоў, Пасынак, Плюціч і Бельска (№ 3). Журы першае месца прызнала калектыву з Бельска, які прыме ўдзел у фінальных элімінацыях у Беластоку. Другое месца занялі школьнікі з Галадоў, а трэцяе — з Аўгустова.

■ 1 красавіка таксама адбыліся ў Бельску павятовыя элімінацыі XIII міжшкольнага конкурсу „Беларуская песня — 73“. Удзельнікамі гэтага конкурсу былі вучні з падставовай школы № 3 у Бельску, з Дубяжына, Орлі, Пашкоўшчыны, Пасынак, Плёсак, Галадоў, Кожына і Катлоў. Сярод салістаў першае і другое месца занялі Г. Каліцэвіч і В. Талавінская са школы № 3 у Бельску, а трэцяе — Я. Салаўянюк з Пасынак. Сярод дуэтаў першае месца камісія прызнала Л. Федарук і З. Іванюк з Плёсак, а другое месца — О. Барышэўскай і В. Себятынскай з Пашкоўшчыны. Сярод тэрцэтаў першае месца занялі Е. Ляшэўская, А. Антанюк і З. Іванюк з Плёсак, а другое — Е. Мінкевіч, В. Дамброўская і Ё. Манаховіч з Пасынак. Сярод квартэтаў першае месца занялі вучні з Дубяжына: В. Сцепанюк, Л. Залеўская, К. Раманюк і Г. Матляя. Другое месца прызнана квартэту: В. Іванюк, Д. Ляшэўская, Л. Федарук і З. Іванюк з Плёсак.

■ Члены БГКТ у Рыбаках, што ў Беластоцкім павеце, грамадскім чынам працавалі пры пабудове фундаменту пад будучую краму.

■ Члены гурткоў БГКТ і ЗСМВ у Залуках (Беластоцкі павет) грамадскім чынам працавалі пры рамонце дарогі ад Залук да Сафіполя.

■ 25 красавіка пенсіянер Хведар Савіцкі — дзеяч рабочага руху сустрэўся з працаўнікамі ГП і з актывам гарадскога аддзела БГКТ. Расказаў ён аб святкаванні 1-га Мая ў санацыйнай Польшчы. Таварыш Савіцкі — былы вязень Картузскай Бярозы. Прысутныя з асаблівай цікавасцю слухалі аб тым, як палітычныя вязні, нягледзячы на жорсткія здзекі, святкавалі міжнароднае свята працоўных.

■ 26 красавіка адбылося пасяджэнне Прэзідыума ГП. Павестка дня была наступная: 1) ацэнка ўдзелу БГКТ у святкаванні 50-ай гадавіны СССР, 2) абмяркоўка рэалізацыі пагаднення аб супрацоўніцтве з ваяводскімі праўленнямі ЗСМВ, „Руху“ і іншымі. Прынялі ўдзел у пасяджэнні Станіслаў Какарэка з „Руху“ і Марыя Кучынская з ТППР.

■ 29 красавіка ў Паўлах з нагоды свята І-га Мая адбылася акадэмія, у мастацкай частцы якой выступілі школьнікі-дэкламатары і драматычны калектыў БГКТ з п'есай „Ноч нявол“ Барыса Сачанкі. (мх)

Падзеі ◊ Здарэнні ◊ Факты ◊ Каментарыі ◊ Веснікі

СВЕТ · БССР · ПОЛЬШЧА · ВАЯВОДСТВА

ВІЗІТ Э. ГЕРКА Ў ЮГАСЛАВІІ

Па запрашэнню старшыні Саюза камуністаў Югаславіі, прэзідэнта Сацыялістычнай Федэратыўнай Рэспублікі Югаславіі Іосіфа Броз-Ціта з 4 па 8 мая пабываў у Югаславіі з афіцыйным візітам І сакратар ЦК ПАРП Эдвард Герэк з жонкаю.

ПЛЕНУМ ЦК КПСС

26—27 красавіка адбыўся Пленум Цэнтральнага Камітэта КПСС.

Пленум заслухаў і абмеркаваў даклад Леаніда Брэжнева аб міжнароднай дзейнасці ЦК КПСС па ажыццяўленню рашэнняў XXIV з'езду партыі. Пленум аднагалосна прыняў пастанову, у якой цалкам і поўнасцю адобрыў праведзеную Палітбюро работу па забеспячэнню трывалага міру ва ўсім свеце і надзейнай бяспекі для савецкага народа, які будуе камунізм. У выступленнях удзельнікаў Пленума і яго пастанове адзначаны вялікі асабісты ўклад Л. Брэжнева ў вырашэнне гэтых задач.

Пленум выказаў поўнасцю згоду з аналізам міжнароднага становішча, які дадзены ў дакладзе Генеральнага сакратара ЦК КПСС і падкрэсліў актуальнасць пастаўленых у ім задач у галіне міжнароднай дзейнасці КПСС.

„Пленум ЦК, — гаворыцца ў пастанове, — даручае Палітбюро і надалей няўхільна ажыццяўляць вызначаны XXIV з'ездам КПСС знешнепалітычны курс, кіруючыся палажэннямі і вывадамі даклада таварыша Л. І. Брэжнева на гэтым Пленуме, змагацца за поўнае ажыццяўленне Праграмы міру, дабівацца таго, каб дасягнутыя змены ў міжнароднай абстаноўцы набылі неабарачальны характар".

У свеце вынікі Пленума расцэньваюцца як новае сведчанне далейшага ўмацавання знешнепалітычных пазіцый Савецкага Саюза, яго міжнароднага прэстыжу, няўхільнага імкнення КПСС і Савецкай дзяржавы актыўна ажыццяўляць гістарычную Праграму міру, прынятую XXIV з'ездам КПСС.

ЛЕНІНСКІЯ ПРЭМІІ

19 красавіка гэтага года пад старшынством акадэміка Д. Скабельцына адбылося пасяджэнне Камітэта па міжнародных Ленінскіх прэміях „За ўмацаванне міру паміж народамі". Камітэт разгледзеў паступіўшыя прапановы аб прысуджэнні міжнародных Ленінскіх прэмій за 1972 год і прыняў пастанову па гэтаму пытанню.

За выдатныя заслугі ў барацьбе за захаванне і ўмацаванне міру прысуджаны міжнародныя Ленінскія прэміі: Леаніду Ільічу Брэжневу — Генеральнаму сакратару ЦК КПСС, Сальвадору Альендэ Госенс — прэзідэнту Рэспублікі Чылі, Энрыке Пастарына — старшыні Сусветнай федэрацыі прафсаюзаў (Уругвай) і Джэймсу Олдрыджу — пісьменніку, грамадскаму дзеячу (Англія).

ІТАЛЬЯНСКАЯ КАМПАРТЫЯ

Больш за 113 тысяч новых членаў уступілі ў рады Італьянскай кампартыі з пачатку гэтага года, паведамляе газета „Уніта". У ходзе штогадовай кампаніі па абмену партыйных білетаў ужо больш чым 1.545 тысяч камуністаў атрымалі білеты ўзору 1973 года. (ак)

У КАЛГАСЕ „1-Е МАЯ"

Мікалай Сачыўка, старшыня калгаса „1-е Мая" Жлобінскага раёна, дэпутат Вярхоўнага Савета БССР, расказвае, што яго супрацоўнікі ў 1971 годзе намалацілі з кожнага гектара па 28,8 цэнтнера збожжавых, накапалі па 208 цэнтнераў бульбы. У мінулым годзе сярэдні ўраджай быў крыху ніжэйшы, бо не спрыяла пагода, але, напрыклад, ячменю сорту „альза" атрымалі яны па 30 цэнтнераў з гектара, а авёс „кондар" даў аж па 40 цэнтнераў. Сакрэт такога высокага ўраджаю заключаецца ў багатай запраўцы глебы ўгнаеннямі, у прымяненні добрага насення і старанный апрацоўцы поля.

ХІМІКІ З ГРОДНА

Гродзенскія хімікі, якія працуюць на хімічна-тукавым камбінаце імя Сяргея Прытыцкага, слаўна сустрэлі Першамай. Яны далі хлебаробам звыш плана аж 10 чыгуначных эшалонаў мінеральных угнаенняў.

ДАПАМОГА ХЛЕБАРОБАМ

Калектывы прадпрыемстваў і арганізацый Кастрычніцкага раёна горада Віцебска накіравалі ў падшэфныя калгасы і саўгасы Шумілінскага і Гарадоцкага раёнаў спецыяльныя групы механізатараў і сем трактараў. На дапамогу выехалі 23 шафёры, 6 трактарыстаў, 7 зваршчыкаў і многа спецыялістаў іншых прафесій. Усе яны дружна ўключыліся ў палявыя работы.

АЦЭНЬВАЮЦЬ РАБОЧЫЯ

Напярэдадні Першамая Дзяржаўны рускі драматычны тэатр імя Горкага паказаў мінчанам новы спектакль — „Тры мінуты Марціна Гроу". Першымі яго гледачамі былі рабочыя, інжынеры і служачыя прадпрыемства „Белэнергарамналадка", якое ў сацыялістычным спаборніцтве заваявала пераходны сцяг.

ФІЛЬМЫ АБ МОЛАДЗІ

Ганаровае званне лаўрэатаў Усесаюзнага фестывалю савецкай моладзі, прысвечанага 50-годдзю ўтварэння СССР, заваявалі рэжысёр Д. Міхлееў і аператар В. Цяслюк. Іх фільм „Птушка ікс", выпушчаны творчым аб'яднаннем „Летапіс" кінастудыі „Беларусьфільм", прызнаны быў лепшым на рэспубліканскім конкурсе дакументальных фільмаў аб моладзі. Стваральнікі гэтага фільма ўдастоены прыза Цэнтральнага Камітэта ЛКСМ Беларусі. Другое месца прысуджана фільму Беларускага тэлебачання „Вяснянка", які расказвае аб аднайменным танцавальным калектыве Магілёўскага аўтамабільнага завода.

ЖЫВАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ ФАЛЬКЛОРУ

Сапраўднай энцыклапедыяй фальклору аказаўся 70-гадовы калгаснік Якаў Прыгодзіч з вёскі Лышча, што каля Пінска. Адкрылі яго вучоныя Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Вялікі знаўца мясцовага фальклору, цікавы субяседнік, ён дапамог сабраць шмат забытых паданняў, легенд і песень Палесся. Увайшлі яны ў зборнік каляндарна-абрадавых, вясельных, салдацкіх, жартоўных песень, частушак і народных прыказак, прымавак і казак Брэсцкай вобласці. Зборнік падрыхтавала выдавецтва універсітэта. (вр)

СВЯТА ПРАЦЫ

Свята працы — 1 Май прайшоў ва ўсёй краіне вельмі ўрачыста і радасна. Быў сонечны дзень і быў гэта 29-ы Першамай у вольнай народнай Польшчы. Найбольшая першамайская дэманстрацыя адбылася, вядома, у Варшаве, дзе на ганаровай трыбуне прысутнічалі найвышэйшыя партыйныя і дзяржаўныя ўлады з першым сакратаром ЦК ПАРП Эдвардам Геркам.

Напярэдадні 1 Мая Эдвард Герэк і прадстаўнікі найвышэйшых улад правялі тэлефонныя размовы з рабочымі на розных фабрыках. А героі сацыялістычнай працы і заслужаныя дзеячы рабочага руху (130 асоб) сустрэліся з Палітбюро ЦК ПАРП.

МАЙСКАЕ СВЯТА КУЛЬТУРЫ

У цэлай краіне распачаліся Дні асветы, кніжкі і прэсы. Кірмашы, выстаўкі, сустрэчы з аўтарамі і журналістамі — гэта галоўныя мерапрыемствы майскіх дзён культуры. Зацікаўленне кніжкай і газетай усё ўзрастае.

ДБАЙНЫ І ХУТКІ ЗБОР ЗЯЛЁНЫХ ПЛЁНАЎ

Гэта вельмі важная справа, бо ад яе залежыць узрост пашаў і гадоўлі. Тэме збору зялёных плёнаў было прысвечана спецыяльнае пасяджэнне сельскагаспадарчай камісіі ЦК ПАРП. А пару дзён раней разглядала агульныя справы сельскай гаспадаркі Палітбюро ЦК ПАРП. Яно дало ўказанні ўраду і прамысловасці наконт павелічэння колькасці сельскагаспадарчых машын і будаўляных матэрыялаў для вёскі.

ДЗЕНЬ МЕТАЛУРГА

Металургія — гэта адна з найважнейшых галін нацыянальнай гаспадаркі, а праца металурга належыць да адной з найцяжэйшых. З нагоды Дня металурга калектыў найбольшага ў краіне металургічнага камбіната „Гута Леніна" заявіў аб выкананні дадатковай прадукцыі на 130 мільёнаў злотых.

У ШВЕЦЫІ

Міністр замежных спраў ПНР Стэфан Альшоўскі пабываў з афіцыйным візітам у Швецыі, дзе правёў таксама размову з прэм'ерам шведскага ўрада Олафам Пальмэ.

ЭКСПАРТ ПАРАХОДАЎ

Наша суднаходная прамысловасць вядома ў свеце. Польскія рабочыя будуюць многа рознага роду суднаў і большасць з іх на экспарт. Аж 6 працэнтаў складае экспарт суднаў у агульным экспарце краіны. З сацыялістычных краін найбольш прадаем суднаў СССР, з капіталістычных — найбольш Нарвегіі і Францыі.

ПРЭЗІДЫУМ СУСВЕТНАГА САВЕТА МІРА Ў ВАРШАВЕ...

...сабраўся на чатырохдзённае пасяджэнне. Сусветны савет міра — гэта арганізацыя, якая была створана на другім кангрэсе сіл міра ў 1950 годзе, які адбываўся ў Варшаве. Сусветны савет міра мае свае нацыянальныя камітэты ў звыш ста краінах свету. На пасяджэнне прыбыў прэм'ер Пётр Ярашэвіч, які выступіў з прывітальнай прамовай. (вл)

ПЕРШАМАЙ

Напярэдадні свята працоўных у будынку ВК партыі адбылася сустрэча экзекутывы ВК і ГК з дзеячамі рабочага руху і перадавікамі працы. 53 чалавекі атрымалі адзнакі „Заслужаны для Беласточчыны", а некалькі старых дзеячоў атрымалі віншавальныя лісты ў сувязі з 50-годдзем дзейнасці ў рабочым руху. Вечарам напярэдадні 1 Мая ў тэатры імя А. Вянгеркі адбыўся ўрачысты канцэрт. Прысутнічалі члены экзекутывы ВК ПАРП на чале з З. Куроўскім, члены Прэзідыума ВРН — са старшынёй Прэзідыума ВРН З. Спрыхам, прадстаўнікі СД і ЗСЛ, ФАН, прафсаюзаў і маладзёжных арганізацый, перадавікі працы прамысловасці і сельскай гаспадаркі, заслужаныя дзеячы рабочага руху. З дакладам выступіў сакратар ВК ПАРП Ул. Юшкевіч, а ў мастацкай частцы — аркестр Войска Польскага і артысты варшаўскай эстрады.

1 Мая працоўныя Беласточчыны ў Беластоку і ў іншых гарадах ваяводства масава выйшлі на першамайскую дэманстрацыю.

НОВАЯ БАЛЬНІЦА

Напярэдадні Першамая ў Беластоку аддадзены ў карыстанне новы будынак дзіцячай бальніцы пры Ваяводскай бальніцы імя Снядэцкага. Гэты будынак, у якім будуць знаходзіцца тры аддзяленні дзіцячай бальніцы, пабудаваны на два гады раней тэрміну. У будынку прасторныя светлыя палаты, сучаснае медыцынскае абсталяванне. У такой бальніцы лепш будзе хворым дзецям і лягчэй працаваць медыцынскаму персаналу.

За выдатную працу будаўнікі і група медыцынскага персаналу на чале з дырэктарам бальніцы А. Доўтірдам атрымалі высокія дзяржаўныя ўзнагароды.

ДНІ АСВЕТЫ, КНІЖКІ І ПРЭСЫ

Пачаліся ўжо традыцыйныя Дні асветы, кніжкі і прэсы. Нядзеля, 6 мая, была першым днём традыцыйных кірмашоў і мастацкіх выступленняў на свежым паветры ў парках. У Беластоку кірмаш „Дома кніжкі" адбыўся па вул. Дзяржынскага, а выдавецкая спулдзельня „Прэса — кніжка — рух" арганізавала вялікі кірмаш у парку ля тэатра імя А. Вянгеркі. Падобныя кірмашы адбываліся ва ўсіх павятовых гарадах. Вялікай папулярнасцю карысталіся латарэі. Падобныя мерапрыемствы адбудуцца і ў наступныя нядзелі мая.

АТРЫМАЛІ ПЕРАХОДНЫ СЦЯГ

Калектыў Прадпрыемства чыгуначнага транспарту ў Лапах (ЗНТК) атрымаў пераходны сцяг Міністэрства камунікацый і прафсаюза чыгуначнікаў. Лапскае прадпрыемства заняло II месца ў спаборніцтве на лепшыя вынікі працы ў сваёй галіне. На ўрачыстасці ўручэння пераходнага сцягу прысутнічаў віцэ-міністр камунікацыі В. Шаблеўскі.

ПАДСУМАВАННЕ

У Аўгустове адбылося падсумаванне вынікаў конкурсу „Жыхары свайму гораду" ў нашым ваяводстве. Вартасць працы грамадскім чынам у пералічэнні на аднаго жыхара найвышэйшая была ў Сямяціцкім і Сэйненскім паветах. Сярод большых гарадоў (больш як 7 тыс. жыхароў) першае месца заняў Аўгустоў. Сярод меншых гарадоў — Цехановец. (яч)

TELEWIZJA WARSZAWA

NIEDZIELA 13.V.

7.40 Program dnia. 7.45 TV Kurs Rolniczy. 8.20 „Przypominamy, radzimy". 8.30 „Nowoczesność w domu i zagrodzie". 9.00 TELERANEK. 10.20 „Antena". 10.35 „Świat, który nie może zaginąć" — film ang. 11.00 „Realiści" — (W kręgu mistrzów sztuki"). 11.30 Zespół Tańca Ludowego im. Harnama w Łodzi. 12.05 Dziennik. 12.20 „Przemiany". 12.50 Dla dzieci: I. Jurgielewiczowa — „Osiem lalek i jeden miś". 13.45 „Dziś Warszawa, jutro Praga" — teleturniej. 14.35 Losowanie Totolotka. 14.55 Sprawozdanie z trasy XXVI Wyścigu Pokoju. 17.30 Reportaż. 17.55 „Romeo i Julia" — film balet. TV Czechosł. 19.20 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.15 „Elżbieta, królowa Anglii" — film ang. — „Lwiątko" odc. I. 21.40 PKF. 21.50 „Sofia-show". 22.35 Magazyn sportowy. Kronika Wyścigu Pokoju.

PONIEDZIAŁEK 14.V.

12.45 TV Technikum Rolnicze: Matematyka. 13.25 TV Technikum Rolnicze: Uprawa roślin. 15.05 i 23.20 Politechnika TV. Kurs przygotowawczy. 16.10 Program dnia. 16.15 Sprawozdanie z trasy XXVI Wyścigu Pokoju. 17.30 Dziennik. 17.40 „Zwierzyniec". 18.10 „Oferty". 18.25 TV Kurier Warszawski. 18.45 „Eureka". 19.20 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.15 Teatr TV: J. A. Kisielewski — „Karykatury". 21.45 „Pryzmat". 22.15 Dziennik. 22.30 Kronika Wyścigu Pokoju. Wiadomości sportowe. 22.50 Gra Emanuel Ax (USA).

WTOREK 15.V.

8.30 „Lwiątko" — film. ang. („Elżbieta, królowa Anglii") odc. I 10.00 Dla szkół: (kl. IV) „W delcie Wisły". 10.55 Dla szkół: (kl. III lic.) Język polski — J. Szaniawski „Żeglarz". 11.30 Filmy dokumentalne. 12.45 Dla szkół: (kl. I lic. Język polski — „Poezja polskiego Oświecenia". 15.20 TV Technikum Rolnicze: Matematyka. 15.55 TV Technikum Rolnicze: Uprawa roślin. 16.25 Program dnia. 16.30 Dziennik. 16.40 TELEWIZJA MŁODYCH. 18.20 TV Kurier Mazowiecki. 18.40 „Miasteczko na szlaku". 19.10 „Przypominamy, radzimy". 19.20 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.15 „Piękna Angelika" — film fab. franc. 21.55 „Ex libris". 22.25 Dziennik. 22.40 Kronika Wyścigu Pokoju. Wiadomości sportowe.

ŚRODA 16.V.

8.15 „Piękna Angelika" — film fab. franc. 9.55 Dla szkół: (kl. VIII) Historia — „Poczdam i Norymberga". 10.25 „Syberyjscy mistrzowie" — film dok. radz. 10.55 Dla szkół: (kl. VII) Fizyka — „Drgania i fale". 11.55 Dla szkół: (kl. VII) Historia — „W przededniu niepodległości". 12.45 TV Technikum Rolnicze: Zoologia. 13.25 TV Technikum Rolnicze: Hodowla zwierząt. 14.00 „Wybieramy zawód". 14.55 Politechnika TV. Kurs przygotowawczy. 16.00 Program dnia. 16.05 Sprawozdanie z trasy XXVI Wyścigu Pokoju. 17.00 Dziennik. 17.30 Sprawozdanie z międzypaństwowego meczu piłki nożnej Polska—Irlandia. 19.20 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.15 „Gwiazdy nad rzeką" — film radz. („Cienie zanikają w południe") odc. V. 21.20 „Świat i Polska". 22.00 „Z dziejów baletu". 22.30 Dziennik. 22.45 Kronika Wyścigu Pokoju. Wiadomości sportowe oraz sprawozdanie z finałowego meczu piłki nożnej o Puchar Zdobywców Pucharów (Saloniki).

CZWARTEK 17.V.

7.55 „Gwiazdy nad rzeką" film radz. („Cienie zanikają w południe") odc. V. 9.00 Dla szkół: (kl. VII) Chemia — „Ważny kwas". 9.55 Dla szkół: (kl. III lic.) Język polski — J. Szaniawski „Żeglarz". 10.55 Dla szół: (kl. III lic.) Język polski — „Aktualności filmowe". 12.45 Dla szkół: (kl. VIII) Język polski — „Władysław Broniewski". 14.00 Matematyka w szkole: „Pogłębianie i utrwalanie materiału nauczania w ćwiczeniach". 14.40 TV Technikum Rolnicze: Zoologia. 15.15 TV Technikum Rolnicze: Hodowla zwierząt. 15.45 Program dnia. 15.50 „Informacje, Towary, Propozycje". 16.10 Sprawozdanie z trasy XXVI Wyścigu Pokoju. 17.20 Dziennik. 17.30 „Ekran z bratkiem". 18.15 PKF. 18.25 TV Kurier Mazowiecki. 18.45 „Kwadrans akademicki". 19.10 „Przypominamy, radzimy". 19.20 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.15 Teatr Sensacji: J. Janicki — „Akcja V". 21.25 „Rodzina". 21.50 „Ekspres nr 26". 22.20 Dziennik. 22.35 Kronika Wyścigu Pokoju. Wiadomości sportowe.

PIĄTEK 18.V.

8.15 „Ludzie przeciwko sobie" — film fab. wł. 9.55 Dla szkół: (kl. I—III lic.) Wychowanie techniczne — „Problemy motoryzacji". 10.25 Filmy dokumentalne. 10.55 Dla szkół: (kl. VII—VIII) Wychowanie techniczne — „Nowoczesna kuchnia". 11.55 Dla szkół: (kl. III lic.) Przysposobienie obronne — „Służba wartownicza". 12.45 TV Technikum Rolnicze: Botanika. 13.20 TV Technikum Rolnicze: Mechanizacja rolnictwa. 14.40 Politechnika TV. Kurs przygotowawczy. 15.45 Program dnia. 15.50 „Nie tylko dla pań". 16.15 Sprawozdanie z trasy XXVI Wyścigu Pokoju. 17.55 Dziennik. 18.05 „Pora na Telesfora". 18.50 TV Kurier Warszawski. 19.20 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.15 Śpiewa Magda Umer. 20.45 „Panorama". 21.25 Teatr TV na świecie: W. Szekspir — „Wieczór Trzech Króli". 23.00 Dziennik. 23.15 Kronika Wyścigu Pokoju. Wiadomości sportowe.

SOBOTA 19.V.

9.40 FILMY Z GRETĄ GARBO: „Jaką mnie pragniesz". 10.55 Dla szkół: (kl. VIII) Nauka o człowieku — „Sprawy 15-latków". 14.20 TV Technikum Rolnicze: Botanika. 14.55 TV Technikum Rolnicze: Mechanizacja rolnictwa. 15.25 Program dnia 15.30 Program I proponuje. 15.50 Redakcja Szkolna zapowiada. 16.00 Telereklama. 16.10 Sprawozdanie z trasy XXVI Wyścigu Pokoju. 17.20 Dziennik. 17.30 Dla młodych widzów: „Starcie" — „Czy lubisz sztukę ludową". 18.00 „Patelnia i księżyc". 18.30 „Pegaz". 19.20 Dobranoc. 19.30 Monitor. 20.15 „Alfabet Rozrywki" — „T — jak tango". 21.15 Dziennik. 21.30 Kronika Wyścigu Pokoju. Wiadomości sportowe. 21.50 FILMY Z GRETĄ GARBO: „Jaką mnie pragniesz". 22.55 „Studio przebojów" — program TV NRD.

ТЭЛЕВІЗІЯ МІНСК

Piątek, 11 maja

8.30 Film. fab. 9.45 Szkoła szachowa. 10.15 Śpiewa K. Radczenko. 11.00 Filmy dokument. 14.15 Program dnia. 15.00 Dla dzieci. 16.10 Białoruś literacka. 17.00 Świat socjalizmu. 17.30 Spektakl TV. 19.00 Czas. 19.50 Artysta Ludowy ZSRR L. Rachlenko. 21.00 Finał szermierczych mistrzostw ZSRR.

Sobota, 12 maja

7.00 Program dnia. 7.30 Koncert. 8.15 Przegląd międzynarodowy. 8.30 Wiersze R. Baradulina. 9.00 Mozaika muzyczna. 9.15 Białe i czarne. 10.40 Film fab. 11.45 Ekran dokument. 13.00 Filmy animowane. 13.30 Film dokument. 14.30 Film fab. 16.20 W świecie zwierząt. 17.50 Film fab. 19.00 Czas. 19.30 Piłka nożna. „Dynamo" (Mińsk) —„Torpedo" (Moskwa).

Niedziela, 13 maja

7.00 Program dnia 8.00 Dla żołnierzy. 8.30 Kiosk muzyczny. 10.00 Mistrzostwa Europy w gimnastyce. 14.15 Filmy animowane. 15.00 Klub filmowy. 15.55 Piłka nożna. ZSRR—Irlandia Płn. 17.50 Film fab. 19.15 Czas. 19.45 Sala tańców. 20.15 Mistrzostwa Europy w gimnastyce.

ПАГАДНЕННЕ ПАМІЖ БГКТ І СТУДЭНТАМІ ВСІ

Пры Вышэйшай інжынерскай школе ў Беластоку існуе дыскусійны фільмовы клуб „Кляпсік". Праца яго не з'яўляецца найлепшай. Цяжкія памяшкальныя ўмовы школы не дазвалялі дэманстраваць там фільмаў. Студэнты пастанавілі знайсці іншы выхад. Дагаварыліся з кіраўніцтвам Галоўнага праўлення БГКТ, якое мае адпаведнае памяшканне.

Нядаўна адбылася скромная ўрачыстасць. У прысутнасці прыбыўшых студэнтаў — членаў ДКФ „Кляпсік" у вялікай зале ГП адбылося падпісанне пагаднення паміж ГП БГКТ і студэнцкай радай ВСІ. Дагавор з боку БГКТ падпісалі Мікола Самоцік, старшыня ГП, і Валя Філіпюк, кіраўнік культурна-асветнага аддзела ГП, а з боку студэнтаў Адам Палуднеўскі, старшыня камісіі культуры Рады СЗСП пры ВСІ, і Міхал Яцкевіч, прадстаўнік ДКФ „Кляпсік".

Згодна з пагадненнем, студэнты будуць карыстацца залай ГП пры праекцыі фільмаў і вядзенні дыскусіі. Студэнцкімі фільмовымі мерапрыемствамі будуць карыстацца члены БГКТ.

Тэкст і фота А. Карпюка



Момант падпісання дагавору: злева М. Яцкевіч, М. Самоцік.



Студэнты — члены ДКФ «Кляпсік» на ўрачыстасці падпісання дагавору.

● ІНФАРМАЦЫІ З ГАРАДКА ●

Не з каляндарным, а з гаспадарчым годам звязаны ўсе гаспадарчыя справы (гаспадарчы год пачынаецца 1 ліпеня і канчаецца 31 чэрвеня). Сяляне гарадоцкай гміны перад I-ым маем выканалі ў 90% план куплі мінеральных угнаенняў. „І напэўна будзе ён выкананы ў 100%", — сцвярджае сакратар гміннай рады В. Савіцкі. Значыць, на сялянскіх палях будзе тут высеяна 4,5 тыс. тон мінеральных угнаенняў.

* ✲ *

У красавіку ў Гарадоцкай гміне многа чаго зрабілі грамадскім чынам. Адрамантавалі кусок дарогі ад станцыі Валілы да Гарадка пры дапамозе машын з мясцовага МБМ. Вартасць чыну ацэнена тут на 220 тыс. зл. Двухкіламетровы адрэзак дарогі паміж Бяляўічамі і Вейкамі наладжвалі ЗМС-аўцы з фабрыкі „Каро" і вучні з пачатковай школы ў Гарадку. Чын гэты акрэсліваецца сумай 50 тыс. зл. Грамадскім чынам будзе абгароджана сядзіба гміны, а перад будынкам будуць пасаджаны кветкі. Выканаюць гэту работу працаўнікі гміны. Усіх грамадскіх работ запланавана ў Гарадоцкай гміне на 450 тыс. зл.

* ✲ *

Па ўсіх вёсках гміны прайшлі спецыяльныя „тройкі" (трохасабовыя свайго роду камісіі), якія вызначылі заданні, звязаныя з упарадкаваннем сяліб, вуліц, агароджаў і г.д. Гэта ў значнай меры паправіць эстэтычны выгляд вёсак. Найбольш псуюць выгляд многіх вёсак паламаныя платы, але ўсе яны будуць наладжаны. У Валілах-вёсцы і на калоніі Меляшкі сяляне адразу ўзяліся за работу. У вёсцы Меляшкі па абодвух баках маставой укладваюцца ходнікі. Пры многіх школах пасаджаны дэкаратыўныя дрэвы — таполя і явар.

* ✲ *

У Гарадку многія жыхары хочуць будаваць дамы, 60 заяў ляжыць у гміне адносна прыдзелу пляцоў. У Гарадку ўжо вызначана 30 пляцаў ды яшчэ 40 у напрамку Валіл можна было б вызначыць. Але на гэта пакуль што няма дазволу ад Ваяводскай рады народовай. А шкада, што так доўга. Вясна — вельмі добры час на будаўніцтва. (мх)



Педагагічная бібліятэка ў Саколцы.
Фота Я. Цялушэцкага.

АДГАЛОСКІ

ПАЭЗІЯ АПАЛІНЭРА НА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

У выдавецтве „Мастацкая літаратура" паявілася падборка твораў славутага французскага паэта **Гіёма Апалінэра.** Кніжка называецца „Зямны акіян". Падрыхтавала яе вядомая беларуская паэтэса Эдзі Агняцвет. Над перакладамі вершаў Апалінэра на беларускую мову працавала яна тры гады.

Кніжку папярэджвае прадмова, якую таксама напісала Эдзі Агняцвет. Між іншым, указвае яна там, што бацькі Апалінэра, які ў сапраўднасці называўся **Вільгельм Астравіцкі,** жылі пад Навагрудкам і толькі пасля студзеньскага паўстання вымушаны былі выехаць за мяжу. Сам Апалінэр нарадзіўся ўжо ў Італіі. З яго імем звязаны новы напрамак у паэзіі канца XIX і пачатку XX стагоддзя. (вр)

АНКЕТА „НІВЫ"

Дарагі наш чытач!

Час ад часу звяртаемся да Вас з просьбай выказаць сваю думку аб „Ніве". Сёння, у Дні асветы, кніжкі і друку, зноў просім Вас адказаць на пытанні анкеты, памагчы нам палепшыць тыднёвік. Сярод удзельнікаў разлясуем кніжныя ўзнагароды.

1. Як рэгулярна Вы чытаеце „Ніву"? (падкрэсльце) кожны нумар — прыкладна адзін нумар у месяц — два-тры нумары ў месяц — радзей, чым адзін нумар у месяц.

2. У які дзень Вы, як правіла, чытаеце „Ніву"? (падкрэсльце) пятніца, субота, нядзеля, панядзелак, аўторак, серада, чацвер.

3. А ў які дзень звычайна купляеце (атрымліваеце) тыднёвік? (падкрэсльце) пятніца, субота, нядзеля, панядзелак, аўторак, серада, чацвер.

4. Пералічыце, калі ласка, хто яшчэ, апрача Вас, чытае той жа экземпляр „Нівы"? (хто з членаў Вашай сям'і, сябры, суседзі і г.д.).

. . . .

5. Колькі год Вы чытаеце „Ніву"? (падкрэсльце) першы год — 2-3 гады — 4-5 год — 6 і больш год.

6. Ніжэй пералічаны асноўныя раздзелы „Нівы". Адзначце крыжыкам у адпаведнай графе, наколькі Вас задавальняе матэрыял гэтых раздзелаў.

	Поўнасцю задавальняе	Больш-менш задавальняе	Не задавальняе	Не маю поўнага меркавання
Арганізацыйнае жыццё				
Гаспадарчае жыццё				
Культура				
Асвета				
Грамадскія пытанні				
Гістарычныя публікацыі				
Трыбуна чытачоў				

7. Скажыце, калі ласка, калі ў свеце або ў нашай краіне адбыліся нейкія важныя падзеі ў палітычным, эканамічным ці культурным жыцці, аб якіх ужо расказалі газеты, радыё, тэлебачанне, што б Вы параілі зрабіць нашаму тыднёвіку? (падкрэсльце) паўтарыць газетныя паведамленні — даць каментарый — надрукаваць фотарэпартаж — апублікаваць матэрыял аб людзях, звязаных з гэтай падзеяй — больш аб гэтай падзеі не пісаць — не маю поўнага меркавання.

8. Як часта Вы чытаеце матэрыялы нашых рубрык? (адзначце крыжыкам у адпаведнай графе).

	Чытаю заўсёды	Чытаю часам	Не чытаю
На ніве БГКТ			
Хроніка БГКТ			
Нашы інтэрв'ю			
Новыя вершы			
Свет			
БССР			
Польшча			
Ваяводства			
Тэлевізія-Варшава			
Тэлевізія-Мінск			
Этнаграфічнае аксэнта			
Адгалоскі			
Белавежа — літстаронка			
Беларуская літаратура (А. Баршчэўскі)			
Людзі добрай работы			
Фальклор			
І так бывае			
Беларусіяна			
Беларускія кнігі			
Карэспандэнцыя з Мінска			
Куток практычных ведаў			
Аповесць у адрэзках			
Парнасік			
Кансультацыя юрыста			
Сардэчныя тайны			
Наша пошта			
Кіно			
„Ніўка" — старонка гумару.			

9. Якія змены, на Вашу думку, адбыліся з „Нівай" за апошнія гады? (падкрэсльце) стала больш цікавай — стала менш цікавай — засталася без змен — не маю поўнага меркавання.

10. Якія раздзелы і рубрыкі „Нівы" Вы прасілі б

пашырыць . . . . скарачаць . . . .

11. Хто з аўтараў „Нівы" найбольш запамятаўся Вам?

12. Ці не змаглі б Вы прапанаваць адну або некалькі тэмаў (праблемаў), з якімі трэба было б выступіць „Ніве"?

. . . .

13. Аб якіх людзях з Вашай мясцовасці варта было б напісаць у „Ніве"?

14. Чаго, на Вашу думку, не хапае „Ніве"?

КРЫХУ АБ САБЕ:

1. Колькі вам год?

2. Адукацыя?

3. Чым займаецеся?

4. Ваш адрас

Дзякуем за адказы, яны памогуць нам у працы. Адказы прымаем да 31 мая гэтага года. Наш адрас:

Redakcja tygodnika „Niwa", skr. poczt. 281, 15-950 Białystok.

© PDF: Kamunikat.org 2023

© PDF: Kamunikat.org 2023

У пушчу па натхненне

Белавежа! Сюды, як на нейкую чароўную выспу, едуць турысты, нашы і замежныя. Тут — непадкупнае харацтво і рэшткі не кранутай рукой чалавека прыроды. Дрэвы ляжаць, як паваліліся, магутныя дубы, што, як кажа легенда, памятаюць яшчэ часы Ягайлы, пахілілі свае тоўстыя галіны да зямлі. Па Белавежскай пушчы ходзіць, як па сваім палацы, яе звярыны кароль — зубр.

Штогод у верасні збіраюцца ў Белавежы мастакі з розных краін, каб чэрпаць тут сваё натхненне і каб перанесці на свае палотны такую прыроду, якую ў Еўропе ўжо можна сустрэць толькі тут.

У 1972 годзе Белавежскі мастацкі пленер упершыню быў афіцыяльна прызнаны мерапрыемствам міжнароднага характару. У верасні мінулага года ўдзельнічалі ў ім, апрача польскіх мастакоў, два мастакі з Францыі, дзве літоўкі, балгарын, прадстаўнік Югаславіі і сімпатычная госця з далёкай Японіі — Ліра Іноэ.

Нядаўна беластачане мелі магчымасць пазнаёміцца з вынікамі VIII Міжнароднага белавежскага мастацкага пленеру на выстаўцы, арганізаванай у залах Беластоцкага акруговага музея ў ратушы.

Па-рознаму адлюстравалі аўтары свае пачуцці, думкі, рэфлексіі пры сутыкненні з чыстай прыродай. У іх розныя формы і метады — побач з традыцыйным жывапісам можна ўбачыць працы выключна абстракцыйныя, сімвалічныя і гіперрэалістычныя, выкананыя рознай тэхнікай; мастакі ж — як маладыя, толькі ўваходзячыя ў жывапіс, так і больш вопытныя жывапісцы, педагогі, навучаючыя ўжо маладое пакаленне. Вось, напрыклад, выкладчык Познанскай мастацкай акадэміі, адзін з найбольш славутых польскіх графікаў — Люцыян Мяноўскі. Белавежа з'явілася перад ім, як цудоўная, чыстая дзяўчына, як німфа на фоне прыроды. Прадставіў свае працы ў Белавежскім пленеры таксама дзекан аддзялення жывапісу Варшаўскай мастацкай акадэміі Тадэуш Дамінік. Кейстут Беразніцкі з Гданьскай мастацкай акадэміі ў сваёй рэфлексійнай карціне прадставіў Белавежу і яе прыроду як музей, як нешта адзінае і непаўторнае ў свеце, як тое, што ўсюды ўжо загінула або гіне на вачах і толькі тут яшчэ мае магчымасць цешыць наша вока.

А ёсць зусім маладыя таленты, як хаця б беластачане Януш Дэбіс і Аліцыя Хароцей, якая працуе пасля заканчэння Лодзінскай мастацкай акадэміі ўсяго першы год, а ў Белавежскім мастацкім пленеры ўжо выстартавала як вопытны, поўнасцю сфарміраваўшыся жывапісец. Яе карціны затрымліваюць міжволі. Яны неспакойныя, як наш век. Нешта жывое і трапяткое ў іх, поўнае трывогі і надзеі.

Беластачане наогул паказалі свае даволі цікавыя карціны. Была гэта, зразумела, найбольшая група мастакоў на пленеры. Звярталі ўвагу сваёй арыгінальнай каларыстыкай карціны Мікалая Валкавыцкага, рэалістычныя малюнкі Аляксандра Вэльса, працы Славаміра Худзіка, Ежы Ленгевіча, Веслава Юркоўскага і іншых.

Але бадай найбольшае прызнанне сярод знаўцаў выклікалі белавежскія працы француза Ігара Дэльма, які, карыстаючыся арыгінальным матэрыялам, абсалютна трапна перадаў у сваіх карцінах колеры, клімат, дух Белавежы.

Тое, што кожны адчуў і перанёс на палатно прыгажосць Белавежы па-свойму, што пры гэтым у кожнага радзіліся іншыя думкі, што Белавежа прынесла канфрантацыю розных форм — гэта якраз адзін з вялікіх плюсаў Белавежскага мастацкага пленеру.

Адно абагульняе большасць прац: крык душы і боль, які выклікаюць у аўтараў рэшткі аўтэнтычнай прыроды, заглушанай сёння тэхнікай і прамысловасцю, якія патрэбны людзям, але не даюць роскашы быць з натурай, да якой як да анахранізму, як да музейнай рэдкасці цягне сучасная чалавека, разумеючага, што цывілізацыя не ў стане стварыць штосьці такое, што магло б замяніць чалавеку непаўтаральна прыгожую, першабытную прыроду.

А ўсё ж шкада, што настрой многіх прац такі пануры, і што мала хто спакусіўся на тое, каб у радасных тонах перанесці на палатно неспатыканае харацтво Белавежскай пушчы.

Калі прыняць аднак пад увагу факт, што Беласточчына ў будучыні мае стаць велізарным турыстычным цэнтрам, нельга не згадзіцца са сцверджаннем, што белавежскія мастацкія пленеры адыгрываюць велізарную ролю ў расслаўленні беластоцкага рэгіёну. І важна ў гэтым аспекце нават не тое, што нехта нешта намаляваў, ды нават, калі гэтыя карціны глядач зразумее не зусім як белавежскія матывы, то ўсё ж мастаку былі яны чымсьці навеяны. А гэта значыць, што ён перажыў Белавежу, а тады прыедзе дадому і раскажа іншым, што перажыць у Белавежы варта.

А. Чэчуга.

Такі ўжо характар...


(Працяг са стар. 1)

слоў перайшлі і да справы. Вёска стварыла грамадскі камітэт пабудовы, у яго склад выбралі і мяне. У нашым сяле каля 120 гаспадароў. Вось аднаго дня рушыў наш камітэт па вёсцы на збор сродкаў да будовы. Ад 9-ай гадзіны раніцы і да 10-тай вечара „абкалядавалі“ мы ўсіх. Выяснялі патрэбы і прымалі ахвяраванні, не толькі грошы, але і саламяныя маты. З матамі мелі крыху клопату, бо трэба было іх прадаць у Цэпэліі. Але ўсё ж сабралі ў суме каля 23 тысяч злотых. План будынка ўзялі з суседніх Грыгораўцаў. Кіраўніком будовы стаў Уладзімір Данілюк, тэхнік, сам ён з Малінікаў. Умела заахвоціў сваіх аднасяльчан да працы. Дапамагло таксама і павятовае праўленне ОСП у Бельску. І вось за мінулы год паўстаў будынак. Цяпер жа, увесну, думаем закончыць унутраны абсталюнак. У будынку будзе і гараж, бо наша 22-асабовая пажарная каманда мае планы абзавесціся добрай процівапажарнай машынай. Потым падумаем пра агароджу будынка, пасадку дрэў і кветак. Прыгожы і карысны будзе аб'ект!


Варта дадаць, што дырэктар С. Бурыла з'яўляецца маторам пабудовы рамізы. І хаця ён з'яўляецца студэнтам завочнага аддзялення беларускай філалогіі Варшаўскага універсітэта, то на ўсё знойдзе час. А калі вылучыцца ў яго вольная хвіліна, едзе да сваіх старых бацькоў у суседнія Грэдалі і памагае ў працы на гаспадарцы.

Такі ўжо характар ў Сцяпана Бурылы — дырэктара пачатковай школы ў Малінніках.

Мікалай Гайдук



У сакавіку раміза ў Малінніках была яшчэ ў рыштаваннях.



Будынак пачатковай школы ў Малінніках Бельскага павету.

Фота М. Гайдука

З ліцэйнага панадворка

Веснавыя парадкі, такія папулярныя на Гайнаўшчыне, не абмінулі і Гайнаўскі беларускі ліцэй.

У першыя сонечныя веснавыя дні на панадворку ліцэя аж роілася ад вучнёўскіх фігурак з лапатамі, граблямі і мётламі. Адны расчышчалі сцежкі, раўнялі іх, сыпалі пясок пад новы ходнік, пракладвалі яго, парадкавалі пляц вакол новага стадыёна, рабілі кветнікі і клумбы, канчаткова ўпарадкавалі вялікі міжшкольны стадыён. Нельга не адзначыць, што вучні гэтага ліцэя ўнеслі найбольшы ўклад грамадскай працы ў будаўніцтва гэтага спартыўнага аб'екта. Цяпер тут адбываюцца трэніроўкі спартыўных секцый і звычайныя заняткі па фізкультуры.

Парадкі не абмінулі і класных пакояў. Сёлета ў ліцэі нанава зроблены і ўпарадкаваны шэраг кабінетаў. Абсталяваны геаграфічны і матэматычны кабінеты, кабінет польскай мовы, гісторыі, зменены выгляд бібліятэкі. Кабінет беларускай мовы зроблены быў ужо раней. А ў бліжэйшы час будуць абсталяваны хімічны і фізічны кабінеты.

Усе кабінеты абсталёўвалі і ўпрыгожвалі самі вучні пад кіраўніцтвам настаўніка Анатоля Корзуна. Асабліва шмат працы ўклалі вучні з 4Б класа Я. Саевіч, Ю. Кубай, Я. Сахарчук, В. Граматовіч, П. Паўлоўскі, Я. Зубрыцкі і іншыя. За гэтую працу хлопцы атрымалі ад дырэктара школы кніжныя ўзнагароды.

(яч)

Беларуская літаратура

Нашаніўская пара

ПУБЛІЦЫСТЫКА „НАШАЙ НІВЫ“ — ЧАСТКА 2

Адной з істотных праблем, звязаных з нацыянальным адраджэннем, якая вельмі часта паяўлялася ў публіцыстыцы „Нашай нівы“, была праблема асветы. Як вядома, у пачатку XIX ст. у Беларусі сістэма нацыянальнай асветы не існавала. Зрэшты, стан асветы вогуле знаходзіўся на вельмі нізкім узроўні. Датычыла гэта не толькі Беларусі, але і ўсёй Рускай імперыі.

З некаторых артыкулаў, змешчаных на старонках „Нашай нівы“, вынікала, што каля 80% усіх жыхароў Беларусі не ўмела ні чытаць, ні пісаць. Публіцысты тыднёвіка прыводзілі статыстыкі аб тым, што фонды, прызначаныя на ўтрыманне паліцыі, значна перарасталі фонды, прызначаныя на народную асвету.

Асабліва інтэнсіўнай становіцца тэма народнай асветы на старонках „Нашай нівы“ ў 1910 і пазнейшых гадах.

Цікавы артыкул аб патрэбах народнай асветы паявіўся ў „Нашай ніве“ ў 1910 г., нр. 3 (30). Артыкул гэты „З нашага жыцця“ быў падпісаны літарамі Ф. Ш. Аўтар лічыў, што асвета мае грамадскае значэнне ў працэсе нацыянальнага адраджэння. Без асветы чалавек не можа выпрацаваць высокіх ідэалаў.

У 1911 годзе ў артыкуле „З нашага жыцця“ (2/1911) Мікіта Абрамчык вельмі крытычна ацаніў стан асветы ў беларускай вёсцы. Гаворыць ён, што ў вёсцы пануе беспрасветная цемра, што людзі не ўмеюць ні чытаць, ні пісаць. У такой сітуацыі, зразумела, не можа быць гутаркі аб распаўсюджванні газет ці кніг.

Абрамчык спасылаецца на дзейнасць маладой рускай інтэлігенцыі, якая ахвотна ідзе ў народ: арганізуе для сялян асвету, тэатр, даклады. Такая дзейнасць рускай інтэлігенцыі спрыяе змяншэнню сярод сялянства п'янства, спрыяе павышэнню разумовага ўзроўню селяніна. На жаль, піша аўтар, беларуская вёска не можа пахваліцца такімі дасягненнямі.

Годам пазней („НН“ 21/1912) у той жа рубрыцы „З нашага жыцця“ паявіўся артыкул Старога Вучыцеля, у якім была ахарактарызавана сітуацыя на Гродзеншчыне. Аўтар вельмі крытычна ацаніў духоўнае жыццё беларуса. „Наш народ, — піша Стары Вучыцель, — так жыве, як жыў і сто лет таму назад. Старыя п'юць манапольку, б'юцца і маладзёж спявае, танцуе, гуляе, цягне манаполіцу і прыпратвае для сябе, што дрэнна паложана, а зімой у карты іграюць, або з дзяўчатамі вечарамі бушуюць“.

Да тэматыкі, закранутай Мікітам Абрамчыкам, вярнуўся ў „Нашай ніве“ (4/1914) Лявон Гмырак. У артыкуле аб вясковай інтэлігенцыі заняўся ён інтэлектуальным узроўнем беларускай інтэлігенцыі і яе адносінамі да народнага жыцця. Гмырак рэзка адмоўна ацаніў інтэлігенцыю з беларускіх вёсак і мястэчак. Аўтар даказваў, што адзіным яе заняткам з'яўляюцца карты і гарэлка. Праўда, Гмырак станоўча ацэньвае настаўнікаў і лекараў, аднак і прадстаўнікам гэтых прафесій закідвае абыякавыя адносіны да родных духоўных патрэб.

„Наша ніва“ не раз кранала праблему паўторнай непісьменнасці. Вучні, якія закончылі некалькі класаў пачатковай школы, не маючы пасля кантакту з кніжкай ці газетай, станавіліся зноў непісьменнымі.

Публіцысты „Нашай нівы“ не раз крытычна ацэньвалі метады навучання ў школах Беларусі. Школа клала націск на навучанне рэлігіі і стара-царкоўнаславянскіх тэкстаў. На вельмі нізкім узроўні стаяла навучанне літаратуры, матэматыкі, біялогіі. Зусім абыякава адносілася школа да гісторыі беларускага народу, да беларускай мовы і беларускай літаратуры.

Публіцыстыка „Нашай нівы“, несумненна, даходзіла да тых, хто быў звязаны з асветай у Беларусі. Перш за ўсё чыталі гэтую публіцыстыку настаўнікі. Бадай настаўнік быў аўтарам „Ліста да Бацькаўшчыны“, змешчанага ў „Нашай ніве“ (4/1915). Аўтар Васіль Крэсіва з вёскі Альковічы Віленскай губерні характарызаваў матэрыяльнае забеспячэнне ў школах Беларусі. У гэтым забеспячэнні бачыў ён адну з прычын нізкага ўзроўню навучання. Васіль Крэсіва пісаў, што школьныя памяшканні абсалютна не прыстасаваны да навучання. Пануе ў іх духата, цеснота і цемната. Усе школьныя прылады ўключна з лавамі, партамі і сталамі павінен выканаць сам настаўнік. Той жа настаўнік павінен атапляць школьныя печы, замятаць класы, прыносіць ваду і г.д. Зразумела, што ўсё гэта не магло спрыяць належнаму ўзроўню школы.

„Наша ніва“ прыслухоўвалася таксама да галасоў беларускага народу аб школьнай сістэме ў краіне. У 1912 годзе „Наша ніва“ апублікавала артыкул „Што думае народ аб школах“. Аўтар артыкула Усціновіч прыводзіць выказванні беларускіх сялян, якія дамагаліся, каб школа была больш практычнай, больш звязанай з жыццём. „Добра бы было, — кажуць яны, — каб апроч граматы вучылі, як хадзіць каля зямлі, гадаваць жывёлу, весці гандаль з купцамі і як паляваць на птушкаў і звяраў“ („Наша ніва“ 2/1912).

Чыгуначнік Астапковіч — нерадавы гаспадар

(Працяг са стар. 1)

— А як суседзі глядзяць на вашыя доследы?

— Некаторыя толькі глядзяць, а некаторыя стараюцца рабіць так, як я раблю, раяцца, распытваюць. Некалькі гаспадароў бралі ў мяне насенне пшаніцы...

Усеагульнай балячкай сельгасгурткоў ёсць тое, што няма адпаведных планаў на гаражы для машын сельгасгуртка. Будаваныя дагэтуль гаражы прадбачвалі толькі месца на трактары і іншыя малыя машыны, а МБМ і сельгасгурткі атрымалі ўжо камбайны, якіх абсалютна няма куды схаваць. Астапковіч зрабіў сам праект на гараж, млын, кузню і выезд для камбайна. Каштарыс гэтага памяшкання — 120 тыс. зл.

Адзін з бліжэйшых планаў Астапковіча — гэта пабудова хлеўні дацкага тыпу на 50 кормнікаў у год. Мяркуе гэта зрабіць з адным з суседзяў.

— Будучы на выстаўцы ў Познані, я бачыў такую хлеўню і яна мне спадабалася. Аднак маю пэўныя крытычныя заўвагі; у гэтай хлеўні за многа жалеза і бетона. Я планую ўвесці больш дзерава.

Васіль Астапковіч — гэта светлы гаспадар. Многа чытае, многа хоча ўвесці ў гаспадарку. Але ён і грамадскі дзеяч. Ужо другі раз выбралі яго радным ГРН, дзейнічае ён і ў сельгасгуртку. Мае свой погляд на сельскую гаспадарку ў раёне Чаромхі.

— На маю думку, у сельскай гаспадарцы было многа хістанняў. Амаль кожны з тутэйшых гаспадароў стараўся запэўніць сабе пастаянную працу і мець адначасова гаспадарку. Так яно і ёсць. А зараз справа так выглядае, што без гаспадароў-рабочых чыгунка не можа жыць і зямля таксама не можа радзіць. Тыя, хто працуе на чыгунцы, уводзяць прагрэс у свае гаспадаркі.

Гэта словы Астапковіча, які, здаецца, вельмі ўмела падглянуў і ацаніў гэтыя справы. Справы гаспадароў-рабочых у рабочых раёнах гэта ніякае зло, гэта неабходнасць.

Аляксей Карпюк

фота аўтара

ГОНАР БАЦЬКІ

Калі вы будзеце ехаць жвіроўкай ад Бельскай шашы ў Плёскі і калі за сабою з левага боку пакінеце некалькі сяліб, ваша вока абавязкова прыцягнуць прыгожыя аканіцы аднаго з многіх пекных дамоў гэтай вёскі. Вось менавіта ў гэтым доме (глядзі здымак) жыве Іван Васілюк са сваёй жонкай Лідай. І калі пачнеце з ім гаварыць пра жыццё-быццё на вёсцы, ён хутка павядзе гаворку аб сваіх дзецях.

— Сын мой Іван, — скажа, — загадвае курынай фермай, робіць вялікую справу для спулдзельні прадукцыйнай у Дарожках, якая выкарыстоўвае нашыя паспулдзельчыя плёскаўскія будынкі.

Бацька раскажа аб цікаўнасцях у вырошчванні куранят і аб тым, як за 8—10 тыдняў прывезеныя некалькіднёвыя кураняты дасягаюць вагі больш 2 кг. А пазнаёміўшыся з сынам, можаце даведацца аб тым, што з кожнай 8—10-тыднёвай гадоўлі (а іх бывае ў год 4—5) спулдзельня прадукцыйная ў Дарожках мае па 200 тыс. злотых і больш чыстага даходу. Можаце таксама пачуць ад яго аб тым, чым трэба карміць куранят, каб яны былі здаровыя і каб хутка прыбывалі на вазе, можаце скарыстаць з яго добрых парад адносна птушкагадоўлі.



Іван Васілюк з канём.

Яшчэ больш заблішчаць вочы бацькі, калі ўспомніць ён пра дачку Людмілу.

„Аб ёй у газетах пішуць часта", — з гонарам і з павагаю выгаварыць гэтыя словы і адразу ўспомніць пра Зосю Балло, Іру Паўлючук, Ліду Максімюк, Олю Амельянчык і Мірка Іванюка. З гэтых асоб складаецца эстрадны плёскаўскі калектыў, які здабыў ужо вялікую папулярнасць і аб якім пісалася, у тым ліку і ў „Ніве", і напэўна будзе яшчэ больш пісацца ў газетах.

Яна вучаніца чацвёртага класа Беларускага ліцэя ў Бельску, з'яўляецца адначасова мастацкім кіраўніком гэтай эстраднай групы. Яна таксама старшыня гуртка БГКТ у Плёсках, які залічаецца да аднаго з лепшых у Бельскім павеце.

Іван Васілюк заслужана ганарыцца сваімі дзецьмі. І ён сам у гэтым адыграў не малую ролю, бо разам са сваёй жонкай Лідай выхаваў іх на добрых і прыкладных людзей.

Тэкст і фота М. Хмялеўскі



Хата Васілюкоў.

ДЗЕ? ШТО? КАЛІ?

Праграма культурных мерапрыемстваў БГКТ на наступны тыдзень.

Беласток. Таварыская вечарына. 19 мая, 19 гадзін. Турнір брыджа. 20 мая, 19 гадзін.

Варшава. Даклад А. Багроўскай аб беларускай кінематаграфіі. 18 мая.

Беластоцкі павет. Бялявічы. Выступленне тэатральнага калектыву з Меляшкоў і хору з Новай Волі. 20 мая, 19 гадзін.

ФАЛЬКЛОР

ЖУРАВЫ



— Чуеш, братка мой, настаў сумны час —
Адлятаюць сінім шляхам журавы ад нас.
Чуці: — Кру, кру, кру!.. У чужыне ўмру...
Пакуль мора пералячу, крылачкі затру.
Мерашчыць у вачах непрагляндны шлях,
Гіне, гіне ў сіняй далі след па журавах.
Чуці: — Кру, кру, кру!.. У чужыне ўмру...
Пакуль мора пералячу, крылачкі затру.
Пакуль мора пералячу, крылачкі затру.

Ад вядомага дзеяча на ніве беларускай народнай культуры ў Польшчы Ніны Мушынскай, 1910 года нараджэння, якая жыве ў мястэчку Гарадок, Беластоцкага павету, запісаў 24 студзеня 1973 г. Мікалай Гайдук. Нотны запіс з магнетафоннай стужкі зрабіў Эдуард Гойлік.

Гэтая песня ўзнікла, бадай, у асяроддзі моладзі, якая ў канцы 20-ых і на пачатку 30-ых гадоў масава выязджала з Заходняй Беларусі ў Амерыку ў пошуках працы.

Васькоўскія спулдзельцы ізноў выходзяць на сваё

Сельскагаспадарчы прадукцыйны кааператыў у Васьках Гайнаўскага павету існуе ўжо нямала гадоў. У сямідзесятым годзе па віне тагачаснага кіраўніцтва кааператыва былі тут немалыя страты. Аднак, калі ў 1971 годзе старшынёю кааператыва стаў Міхась Хмель, усё пайшло на лепшае. Цяпер кааператыў вядзе гаспадарку на трохсот гектарах зямельных угоддзяў і аб'ядноўвае 25 сем'яў. У мінулым годзе кааператыў меў даволі высокія ўраджаі збожжавых культур, пад якія адвёў палавіну ўсіх сваіх угоддзяў. Асабліва ўрадзіла пшаніца „данькоўская белая", якая сыпнула па 26 цэнтнераў з гектара. Апрача таго, кааператыў мае добрыя вынікі ў жывёлагадоўлі. Спулдзельцы гадуюць больш дваццаці тысяч штук курэй-брайлераў, свіней і цялят-шаралесаў. Для шаралесаў у гэтым годзе будзе адведзена 38 гектараў пасбішчаў для кватэрнага выпасу. У будучыні асноўным напрамкам у жывёлагадоўлі будзе свінагадоўля. У гэтым годзе будзе закуплена 250 парасят.

Пра механізацыю палявых работ расказала нам асістэнт агранома Валянціна Лаўрэшук. Кааператыў мае камбайн „Бізон", які проста неабходны пры ўборцы збожжа. Сёлета спулдзельцы атрымаюць таксама новыя сельгасмашыны: трактар, бульбакапалку, глебагрызалку і іншыя.

Васькоўскія спулдзельцы хваляць працу ў кааператыве. У мінулым годзе ў гадавым падліку на аднаго спулдзельца выпала па 15 і 20 тысяч злотых. А як вядома, кожная сям'я кааператыўшчыкаў мае свае ўласныя паўгектаровыя прысялібныя гаспадаркі і самастойна вырошчвае бульбу, агародніну, фрукты. Некаторыя гадуюць кароў, свіней і курэй. Малако дастаўляюць яны на пункт скупкі малака і такім чынам прыбывае, як гавораць, свежы грош у хату. Спулдзельцы ў дамашняй гаспадарцы карыстаюцца лядоўкамі, пралькамі і іншым абсталяваннем хатняга ўжытку. Маюць тэлевізары і радыёпрыёмнікі.

Спулдзельцы з Васькоў належна шануюць супольнае дабро, усюды лад і парадак. Два гады таму назад, калі былі немалыя страты ў кааператыве, спулдзельцы самі спынілі дрэнную дзейнасць старшыні і справу накіравалі ў суд. Змяніўся старшыня, і кааператыў зноў стаў у ліку лепшых сярод іншых сельскагаспадарчых кааператываў на Гайнаўшчыне. Васькоўскія спулдзельцы найлепш ведаюць, калі ў іх кааператыве дзеецца зло, і адразу перадольваюць яго. Тут яны самі гаспадары.


Я. Цялушэцкі

КЛУБ „РУХ" — ЦЭНТР КУЛЬТУРНАГА ЖЫЦЦЯ

Клуб „Рух" у Васількове Беластоцкага павету быў адкрыты ў 1971 годзе. Клуб атрымаў поўнае абсталяванне ўключна з тэлевізарам ды магнетафонам. Да маладых наведвальнікаў належала ўжо, каб было тут прыемна і культурна. За гэта ўзяліся члены мясцовых арганізацый ЗСМВ і БГКТ. Вельмі дапамагала ў арганізацыі культурных мерапрыемстваў кіраўнік клуба Гражына Стэфанчук. Моладзь пачала арганізаваць танцавальныя вечарыны, але не толькі для адных танцаў, як гэта амаль усюды прынялося. Танцы праходзілі тут упераменшку са згадуй-згадуляй, конкурсамі, песнямі, рознымі іграмі. Моладзь ахвотна ішла на аўтарскія сустрэчы з пісьменнікамі (Марыяй Шулецкай, Аляксандрам Амільяновічам), з журналістамі, мясцовымі дзеячамі. Пры клубе пачалі працаваць гурткі шахматыстаў, брыджыстаў і мастакоў-жывапісцаў. Неўзабаве пачне працу вакальна-музычны калектыў. Моладзь з Васількова любіць добрую музыку і песні. Вельмі цёпла ўспрымаўся ёю канцэрт, у якім выконваліся песні Булата Акуджавы. Маладыя гаспадары клуба адзначаюць у клубе дзяржаўныя святы, а таксама розныя гадавіны.

У апошні час члены БГКТ узяліся за падрыхтоўку пастаноўкі на беларускай мове пад загалоўкам „Міхалка", а таксама ахвотна заняліся арганізацыяй аркестра і выплаўліваннем са свайго асяроддзя добрых салістак, якія спявалі б песні не толькі на польскай мове, але таксама на рускай і беларускай. Усе рыхтуюцца да турніра шахматыстаў на кубак старшыні мясцовага жыллёвага кааператыва. У працы клуба асабліва вылучаюцца: Аня Федаровіч, Казімір Святліцкі, Юзэф Данілевіч, Марыся Дзеніс, Тадэуш Вайтулевіч, Збышак Вішаваты і іншыя.

Я. Цялушэцкі



Канвеер для выканчэння і камплектацыі блок-пакояў.

КАРЭСПАНДЭНЦЫЯ З МІНСКА

Трэці домабудаўнічы



Пагрузка блок-пакояў для транспарціроўкі на мантажную пляцоўку.

Мінскі домабудаўнічы камбінат № 3 — адно з нямногіх у краіне прадпрыемстваў, якое выпускае... кватэры. Гэта не агаворка. На камбінаце сапраўды вырабляюцца пакоі з усім неабходным абсталяваннем. Дастаўляюць такі блок-пакой на будаўнічую пляцоўку, і будаўнікам застаецца толькі сабраць дом. Таму і праца на будаўніцтве ідзе шпарка. Брыгада ў 6—8 чалавек за чатыры змены мантуе цэлы паверх. На будаўніцтва пяціпавярховага васьмідзесяцікватэрнага дома ідзе не больш тыдня.

Як жа вырабляюцца гэтыя блок-пакоі?


І вось мы на прадпрыемстве. Велізарны з вокнамі на ўсю сцяну корпус запоўнены бетоннымі кубамі. Тут пачынаецца праца па стварэнню будучага блок-пакоя. Вось мадэль. Яна прадстаўляе сабой унутранае абсталяванне пакоя. На мадэлі ўстанаўліваюцца калоны, якія злучаюцца паміж сабой сеткай з дроту. Гэта — шкілет будучага памяшкання. Форма ў ажурным пакрывале перамяшчаецца на пост арміравання і распалубкі. Тут у яе ўплятаюцца электраправодка з вывадамі для разетак.

Пост распалубкі прадстаўляе сабой фармовачную ўстаноўку з рухомымі сценамі. Пасля перамяшчэння мадэлі транспарцёрам, сцены ўстаноўкі ссоўваюцца. Пры гэтым ўтвараюцца пустоты. У іх і заліваецца бетон. Заліўка адбываецца спецыяльным бетонаўкладчыкам. Дзеля таго, каб у бетоне не было пустот, раствор ушчыльняюць з дапамогай вібратараў. Калі сцены заліты раствoрам, заліваюць столь блок-пакоя. Нарэшце заліўка закончана. Пачынаецца тэрмаапрацоўка сфарміраванага блок-пакоя. У кожнай сцяне ўстаноўкі ўмантаваны спецыяльныя спіралі. Праз іх прапускаецца электрычны ток. У выніку атрымліваецца высокая тэмпература. Робіцца „сушка" раствора. Тэрмаапрацоўка працягваецца пяць гадзін. Яна спрыяе больш інтэнсіўнаму згушчэнню бетона, што неабходна для атрымання сцен высокай трываласці. Пасля гэтага выраб паступае ў камеру даспявання. Тут на працягу пяці гадзін падтрымліваецца акрэсленая тэмпература. Бетон канчаткова даспявае.

Пасля тэрмаапрацоўкі атрыманы блок-пакой маставым кранам пераносіцца на раней сфарміраваную падлогу і з дапамогай электразваркі змацоўваецца з ім. Пасля гэтага пачынаецца мантаж унутраных дэталяў. Сантэхнікі ўстанаўліваюць батарэі цэнтральнага ацяплення, ванны і іншае абсталяванне. Электрыкі завяршаюць работы па электраправодцы. У той жа час сталяры падрыхтоўваюць і ўстанаўліваюць дзверы, шафы. Шкляры шкляць вокны. Затым выканчваюць памяшканні і фасад. І блок-пакой гатовы. На ўвесь цыкл работ — ад выраблення арматуры да выканчэння патрабуецца двое сутак.

На камбінаце ўсе працы выконваюцца механізмамі. Цяпер прадпрыемства за суткі выпускае 24 блок-пакоі. Калі камбінат дасягне запланаванай магутнасці, гэта лічба павялічыцца ў паўтара раза.

Г. Шэўчак
фота В. Казлова



Новыя дамы на праспекце імя Сяргея Прытыцкага.

Куток практычных ведаў



У НАШАЙ КУХНІ

У наш неспакойны і шпаркі век гаспадыні не маюць замнога часу, які б маглі прысвяціць кухні. А ўсё ж варыць трэба, бо ніякая сталоўка, ніякі рэстаран не дасць такога задавальнення, як добры, хатні абед, хаця і падрыхтаваны нягаз „на хуткую руку".

Таму вельмі важна пры абсталёўванні кухні падумаць аб тым, каб месца, дзе зазвычай гаспадыня падрыхтоўвае ежу, было зручнае, каб гаспадыні было трэба як найменш гадзін хадзіць, каб усё патрэбнае на кухні для падрыхтоўкі ежы максімальна сканцэнтраваць у адным месцы. Рухі гаспадыні павінны быць абмежаваны да мінімума — усё павінна быць пад рукой: і каструлькі, і прадукты, і нейкае вядро на адпадкі.

Вопыт паказаў, што найлепш абсталёўваць такое месца паміж злевам ці вадняркай (калі ў хаце няма водаправода) і плітой. Гэтая плошча не можа быць меншай, чым 60—100 см у даўжыню і 40—60 см у шырыню. Непадалёку павінен знаходзіцца посуд для прыпраў — цукру, солі, перцу і т.д. У ніжніх шафках з аднаго боку можна ставіць каструлькі ці іншыя прадметы, патрэбныя для падрыхтоўкі ежы, а ў шафцы пад злевам можна паставіць вядро ці нейкае іншае абсталяванне на адпадкі, якое найлепш было б завесіць на дзверцах.

Вельмі важна таксама, каб кухонная мэбля была зроблена з адпаведнага матэрыялу. У сучасны момант ёсць пад дастаткам кухоннай мэблі і для горада і для вёскі. Выбар багаты, і кожны паводле свайго густу і патрэб можа падабраць да сваёй кухні адпаведныя сегменты. Зроблены яны найчасцей з ламінату, дзякуючы якому іх паверхня не баіцца не толькі вады, але і квасаў, і высокай тэмпературы. Нічога не здарыцца, калі на ламінаваную шафку ўпадзе запаленая запалка, можна на яе таксама спакойна паставіць гарачую каструльку і г.д.

Мэбля з ламінату баіцца аднак механічнага пашкоджання. Таму ні ў якім выпадку нельга на ламінаце рэзаць нешта нажом або сячы сякерай.

Кухонныя сегменты неабходна мыць вадой з мылам, ці з якой-небудзь далікатнай вадкасцю, змякчаючай ваду.

Варта, што можна, рабіць на кухні седзячы, асабліва, калі работа гэта займае шмат часу, як, напрыклад, чышчэнне гародніны, рыбы, збіванне пены, мяшанне цеста і г.д. Сядзець пры гэтым трэба так, каб стамляцца як найменш. Таму варта падставіць пад ногі маленькі табурэцік і сядзець на стуле, абапершыся на яго спінку.

Па добрай, зручнай кухні відаць добрых, разумных гаспадароў.

Гаспадыня

ЭРЫХ ЛЕСТ



АПЕРАЦЫЯ „БУМЕРАНГ"

У тую ноч Будэр паслаў радыёграму, якую склалі капітан і Вайтхазе, быццам бы падпісаную падпалкоўнікам Грэльхамерам, які на самай справе шмат ужо тыдняў знаходзіўся ў лагеры для ваеннапалонных і нічога нават не сніў пра кацёл. Потым усе залезлі пад свае коўдры і спалі да самай раніцы.

З гэтага дня яны павялі спакойны, размераны спосаб жыцця. Клапатліва абсталявалі лагер, выкапалі тры зямлянкі — для сябе, для прадуктаў і для рацыі. Лавілі трусоў, збіралі грыбы, а Будэр зрабіў сабе вуду і, схаваўшыся ў гэтых кустах, выцягваў з возера фунтовыя рыбіны. Прывялі ў парадак сябе і адзенне і ў паўдзённыя гадзіны загаралі пад цёплым яшчэ восеньскім сонцам. Будэр пачаў звыкацца з такім жыццём і быў бы ўсім задаволены, каб яго ўвесь час не мучыла думка пра лёс акружаных войск. Кожныя дзве ночы ён пасылаў новую радыёграму, і змест іх рабіўся ўсё больш і больш змрочным. Тэкст прыносіў Вайтхазе. Ён ішоў пеша пяць кіламетраў да бярозавай дарогі, дзе цяпер знаходзіўся маленькі лагер — некалькі савецкіх салдат з коньмі, адтуль вярхом ехаў у вёску, там разам з капітанам складаў чарговую радыёграму, а наступнай ноччу вяртаўся назад. З сабой заўсёды прыносіў багаты харч.

Іншы раз капітан сам суправаджаў Вайтхазе да маленькага лагера ў лесе. Тыдні праз чатыры пасля таго, як Мартынаў пакінуў радыёгрупу, капітан сказаў Вайтхазе:

— Мы давялі ўжо колькасць акружаных войск да шасцісот пяцідзесяці. Цяпер крыху запаволім працэс знішчэння, інакш фашысты страцяць да катла ўсякую цікавасць.

— Можа гэта ўжо здарылася?

— Пакуль што, здаецца, не, — адказаў капітан. — Мы з іх яшчэ крышачку сіл высмакчам.

Яшчэ раз прачыталі апошнюю радыёграму з Усходняй Прусіі: „Самалёты і бензін абмежаваныя. Вымушаны скараціць палёты. Прасіце толькі самае неабходнае".

— Гэта не прыкмета страты зацікаўленасці, — сказаў капітан. — Яны б з ахвотай пастараліся лепш забяспечваць кацёл, але ўжо не могуць. Нашы ім даюць прыкурыць, ды і мы нямала з іх выцягнулі.

З гэтага дня фашысцкі кацёл пачаў паволі паміраць. Радыёграмы рабіліся ўсё больш роспачнымі, і ўсё менш самалётаў адважваліся пускацца ў далёкі шлях з Кенігсберга ў пушчу на поўнач ад Віцебска.

— Справа ідзе к канцу, — аднойчы канстатаваў Будэр. — Ці не пара ўжо здаваць кацёл?

— Гэта ад нас не залежыць, — адказаў Вайтхазе. — Такія пытанні вырашае фюрэр.

Твар Будэра зрабіўся змрочным. Самалётаў прылятала ўжо зусім мала. Аднойчы ў адным паку аказалася дубовае лісце да рыцарскага крыжа, якім Гітлер узнагародзіў свайго вернага падпалкоўніка Грэльхамера.

— Гэта прыкмета таго, — сказаў капітан, — што яны вырашылі скора развітацца з катлом. Час канчаць.

На наступны дзень, шэрай восеньскай раніцай, Будэра расштурхалі ад сну, і, расплюшчыўшы вочы, ён убачыў перад сабой савецкіх салдат. Ён памкнуўся ўскочыць на ногі, але Вайтхазе моцна трымаў яго.

— Спакойна, — загадаў Вайтхазе. — Не рабіце глупстваў. Пісталет ваш у мяне.

Будэр недаўменна пазіраў на ўсё, што рабілася навокал, — на савецкіх салдат, якія выносілі з зямлянкі рацыю, на рускага афіцэра, які сказаў яму на бездакорнай, хоць і з некаторым акцэнтам, нямецкай мове.

— Гэта называецца неспадзяваны напад, ці не так, Будэр?

Будэр глянуў на Вайтхазе, які трымаў у руках яго пісталет, на Франке, які павесіў сабе на шыю два аўтаматы — свой і Будэраў. Ён не мог зразумець, чаму Вайтхазе гаварыў з савецкім афіцэрам па-руску, і абодва весела смяяліся.

— Паслухайце, Будэр, — пачаў асцярожна Вайтхазе. — Вы зараз пачуеце нешта нечаканае. Што б вы сказалі, каб пачулі, што ніякага катла ніколі не існавала?

Будэр хацеў адказаць, што цяпер не час жартаваць і гаварыць глупства. Але толькі падумаў: „Вось я і ў палоне. Апошні час мне нешта гаварыла, што іншага канца не будзе. Чамусьці здавалася, што мяне не заб'юць. Палон лепш, чым смерць".

Будэр пачуў скрыгат грузавіка, які прадзіраўся скрозь кусты да возера.

— Нашы рэчы павязуць на машыне, — сказаў Вайтхазе Будэру. — А мы пойдзем пеша, не вельмі далёка. Адтуль паедзем на конях. Не рабіце глупстваў, не спрабуйце бегчы ці што-небудзь такое — не мае ніякага сэнсу.

Пакуль Франке разам з рускімі салдатамі грузіў рэчы ў машыну, Вайтхазе расказаў Будэру ўсю гісторыю, у якой Будэру была адведзена такая важная роля. Сам таго не ведаючы, ён справіўся з ёю выдатна.

ТРЫБУНА чытачоў

ВЕСТКІ З БЕЛАСТОЦКАГА ПАВЕТУ

8 красавіка гэтага года ў акрузе гміны Міхалова адбыліся грамадскія чыны пры рамонце дарог. Дзень раней тутэйшая моладзь парадкавала прышкольныя ўчасткі.

* * *

8 красавіка гэтага года ў Малачарскім тэхнікуме ў Беластоку адбыўся агляд мастацкіх калектываў асноўных сельскагаспадарчых школ Беластоцкага ваяводства. Прыняло ў ім удзел 8 калектываў. Найбольш было з Беластоцкага павету — 3. Найлепшым аказаўся калектыў з Рудкі Бельскага павету.

* * *

У заблудаўскай школе адбыліся спаборніцтвы па настольнаму тэнісу сярод настаўнікаў нашага павету. Удзельнічала 11 настаўнікаў з мясцовасцей: Ялоўкі, Міхалова, Заблудава, Грыбаўцоў, Вейкаў і Сякеркаў. Першае месца заваяваў Мікола Матыс з Міхалова. Арганізатарам спаборніцтва быў павятовы аддзел Саюза польскіх настаўнікаў у Беластоку.

М. Краўчук
Патока

Кансультацыя ЮРЫСТА

ПЫТАННЕ: Сусед, будуючы дом, заняў каля трох метраў майго пляцу. Ці можна патрабаваць, каб ён адсунуў свой будынак, а калі не, то ці можна патрабаваць ад яго рэкампенсаты. Пляц той у выніку яго звужэння значна страціў сваю вартасць.

АДКАЗ: Калі сусед заняў частку чужога пляцу наўмысна, уласнік гэтага пляцу можа патрабаваць ад яго, каб ён перасунуў свой будынак. Калі сусед нарушыў гэтую граніцу няхочучы, г. зн. не ведаў, што перайшоў граніцу, або нават падазраваў, што заняў частку суседняга пляцу, але праз нядбайнасць не хацеў гэтага спраўдзіць, то ў асноўным не можна ад яго патрабаваць, каб ён перанёс сваю пабудову на свой пляц. Такое патрабаванне было б магчыма толькі ў двух выпадках: І) Калі б уласнік пляцу неадкладна супрацівіўся будаванню на яго пляцы. Калі б ён паводзіў сябе пасіўна і зарэагаваў тады, калі сусед зрабіў ужо значныя затраты на пабудову, патрабаванне пераносу будынку недапушчальна. У гэткім выпадку можна ад яго патрабаваць узнагароджання за ўстанаўленне адпаведнага сервітуту на занятай часткі пляцу, або дамагацца, каб ён выкупіў занятую пад будынак зямлю, а таксама тую частку, якая ў выніку будовы страціла для яго гаспадарчае значэнне. 2) Калі ўласніку пляцу, граніца якога нарушана, пагражае значная шкода. Прыкладам, у выніку звужэння яго пляцу, не можа ён сам будавацца на сваім пляцу. У гэткім выпадку можна патрабаваць, каб сусед перасунуў свой будынак на сваю зямлю.

— План склаў капітан. Я таксама крышачку дапамог — што датычыць складу думак і характэрных асаблівасцей некаторых фашысцкіх начальнікаў. Потым Кноблах перайшоў фронт і расказаў сваю легенду генералу і эсэсаўцу, і з таго часу ўсё пачалося.

„Здраднікі, — падумаў Будэр. — Вайтхазе і Кноблах, і Франке". Ён хацеў сказаць гэта проста ў твар Вайтхазе, але, глянуўшы на яго, падумаў, што не мае права гэтага рабіць, бо знаходзіцца ў палоне.

— Вы не адразу, можа, разбярэцеся, Будэр, — сказаў Вайтхазе. — Патрэбен час. Хто ведае, што вы цяпер пра нас думаеце. Я на самой справе обер-лейтэнант, гэта значыць быў ім да таго, як два з палавінай гады таму назад трапіў у палон. Кноблах быў унтэр-афіцэрам, а Франке салдатам. Абодва яны камуністы.

— А вы?

— Сам не ведаю, — адказаў Вайтхазе. — Фармальна не.

— Чаму ж вы так паступілі?

— Таму што ненавіджу фашызм.

— Вы здраднік.

— Не, — упэўнена сказаў Вайтхазе, — я не здраднік.

Капітан спусціўся да возера і памахаў ім рукой, паказваючы, каб яны ішлі за ім. Яны пайшлі.

— Думаю, — сказаў Будэру Вайтхазе, — вы неўзабаве разбярэцеся і зразумееце, што да чаго.

Пераклаў з нямецкай мовы
С. Дорскі

Адказ Бельскай гміны

З прыемнасцю паведамляем нашым чытачам, што Гміннае ўпраўленне ў Бельску Падляшскім дало хуткі і пазітыўны адказ на справу, закранутую намі. Справа датычылася заканчэння пабудаванай грамадскім чынам святліцы ў вёсцы Дубяжына. Усю гісторыю будовы грамадскім чынам дубяжынскай святліцы і ўсе клопаты з яе заканчэннем апісаў у свой час у „Ніве" Мікалай Раманюк — наш карэспандэнт з Дубяжына. Публікацыя выйшла пад загалоўкам „Дубяжынскія прыгоды".

Артыкул нашага карэспандэнта разам з рэдакцыйным лістам мы накіравалі ў Бельскую гміну і 11.04.1973 года атрымалі наступны адказ:

„Urząd Gminny w Bielsku Podlaskim uprzejmie zawiadamia, iż w planach rozwoju gospodarczego gminy bielskiej ujęliśmy m. in. wykończenie świetlicy wsi Dubiażyn.

W dniu 12 lutego br. podpisaliśmy umowę z Rzemieślniczą Spółdzielnią Zaopatrzenia i Zbytu w Siemiatyczach na wykonanie prac wykończeniowych świetlicy. Ostateczny termin zakończenia robót ustaliliśmy na 30 maja 1973 r.

W związku z tym w roku bieżącym mieszkańcy wsi Dubiażyn będą korzystać ze świetlicy całkowicie wykończonej".

Падпісаў — начальнік гміны мгр інж. Ежы Каліна.

Такога самага зместу ліст гміна выслала таксама аўтару артыкула Мікалаю Раманюку ў Дубяжына.

Верым, што нашы карэспандэнты з Дубяжына напішуць нам аб заканчэнні будовы святліцы да 30 мая гэтага года.

(вл)

Сардэчныя ТАЙНЫ

Дарагое „Сэрцайка"!

Мне 25 год. Жыву я на вёсцы і працую на гаспадарцы. У мяне ёсць яшчэ дзве сястры, ужо замужнія, жывуць у горадзе. Пасля заканчэння пачатковай школы, я пайшоў вучыцца ў сярэднюю школу. Калі я вучыўся ў трэцім класе, памёр мой бацька. На гаспадарцы засталася адна маці, а, вядома, адной жанчыне цяжка на гаспадарцы, а да таго яшчэ мама часта хварэла. Таму я вырашыў кінуць навуку і вярнуцца на гаспадарку. Шкада было мне гэтых год навукі ў сярэдняй школе. Думаў, што проста змарнаваў я іх, што навука мне не прыдасца. Аднак, працуючы на гаспадарцы, я пераканаўся, як патрэбны веды сучаснаму гаспадару. Гаспадарка ў нас добрая. Нядаўна пабудавалі мы з мамай хлявы і спецыялізуемся ў гадоўлі свіней. Гэта прыносіць нам вялікі даход. Многія працы ўжо механізаваны і гэта аблягчае нам працу і эканоміць час. Хаця і шмат работы на вёсцы, але я маю час паглядзець тэлевізар, удзельнічаць у драматычным гуртку і розных культурных мерапрыемствах. Па-мойму, на вёсцы, калі добра і па-сучаснаму гаспадарыць, дык можна на ўсё знайсці час. Але што ж, калі мая дзяўчына, 19-гадовая Аня, з якой хаджу амаль год, не згаджаецца са мной. Яна хацела б жыць у горадзе, хаця сама закончыла толькі восем класаў. Гаворыць, што жыццё ў горадзе цікавейшае. Нагаварвае, каб я кінуў гаспадарку і ішоў у горад. Я аднак у горад не пайду, бо ведаю, што калі няма добрага фаху, дык і ў горадзе нялёгка. Парай, „Сэрцайка", як мне яе пераканаць. Кахаю ж яе і хацеў бы ўжо ажаніцца. Ну, і хацеў бы, „Сэрцайка", пачуць твой погляд на гэтыя справы.

Уладэк з Бельшчыны

Уладэк! Я поўнасцю згаджаюся з табой. Хвалю цябе за тое, што хаця ты малады хлапец, а так добра, па-сучаснаму вядзеш гаспадарку, якая, як сам пішаш, прыносіць табе вялікі даход. І было б вельмі неразумна пакідаць усё нажытае і пэўнае і ісці шукаць нечага невядомага. Неразважнасць Ані можна ўсправядлівіць толькі яе маладымі гадамі. Якія ж былі б вашы перспектывы ў горадзе, калі вы не маеце падрыхтоўкі да жыцця ў ім. А на вёсцы яны вельмі вялікія. Мне здаецца, што Аня павінна зразумець, што і ў горадзе манна з неба не падае, ды печаныя галубцы самі ў рот не ляцяць.

Сэрцайка

Грамадскім чынам

15 красавіка на дарогу Вітава-станцыя выйшлі людзі з Вітава, Дубіч Царкоўных і Тафілаўцаў, Доўгага Броду і Пасечнікаў. Адбыўся тут грамадскі чын: выкапана каля 500 метраў равоў абапал дарогі.

Чын быў паўтораны 17 красавіка. У гэты дзень было зроблена каля 400 метраў дарогі.

Падобны чын быў арганізаваны таксама 15 красавіка на дарозе Чэхі Арлянскія — станцыя Вітава. Жыхары Чэхаў Арлянскіх выкапалі каля 350 метраў равоў абапал гэтай дарогі.

Гэтымі карыснымі працамі кіраваў Іван Майстровіч са сваім памочнікам Кастусём Чыквінам. Ініцыятарам работ была гміна ў Дубічах Царкоўных.

Мікалай Панфілюк,
Дубічы Царкоўныя

НОВАЕ

Мой сусед Васіль Зайкоўскі вырошчвае раннюю гародніну. Дагэтуль рабіў гэта ў малой, накрытай шклом цяпліцы, якую атопліваў звычайнай жалезнай печкай. У гэтым годзе знайшоў новы спосаб. Зрабіў з жэрдак рыштаванне (50 на 40 метраў) і накрыў фоліяй. Цяпер грэюць толькі сонечныя праменні. Пасадзіў у гэтай вялікай цяпліцы ранія агуркі, памідоры і капусту. Усё расце добра. Канструкцыя выклікае ў Бельску агульнае зацікаўленне.

Нестар Перавой,
Бельск

ПАРНАСік

Чытальніцкая літсуполка на негарантаваных паях

* * *

Нябачна і ціха
Прыйшла ты
ў народ наш
Радасцю сэрцы напоўніла
цёплай
чароўнай
Жаданай крыніцай — вадой ледзяною
зняла ты цяжары
зімніцы
Грудзі
мацней і свабодна
ўздыхнулі
Прастор асвяціўся праменнем-вясёлкай
І неба адкрыла
свой чар векавы
Нагрэўшыся золатам сонца
Ад гэтай чароўнасці
кветак-праменняў
Зямля сваю волю пачула
Зямля прачынаецца траўкай зялёнай
А дзе то і чорнай лысінай
Над ёю у буйным прасторы
і чыстым
Птушынкі песні спяваюць
А спеў іх прыемна ўпадае ў сэрца
Нясе з сабой гукі забыты
І шчасцем напоўнены
нясу яго
людзям
А сам у нябыт адыходжу
Іду...

Юрка Харкевіч
Ляшукі

НяСлаўная хроніка

■ 21 красавіка каля вёскі Урачыскі-Давідаўка Гайнаўскага павету дзеці спалілі 4 гектары лесу (сасновых саджанак) Страты сялян вёскі Чаромха амаль на 20 000 зл.

■ 21 красавіка ў Лупянцы Беластоцкага павету дзеці спалілі клуню Мікалая Грыкі. Страты каля 30 000 зл.

наша ПОШТА

Яўгень Семянюк, Грыгораўцы. Дакараеце нас, што мы не выказаліся адносна вашых вершаў больш ясна. Гэта не так проста, як вам здаецца. Вось і цяпер вы патрабуеце ад нас ацэнкі новых вершаў і адначасова пішаце: „Калі штосьці не так", дык не крытыкуйце, а выкіньце проста ў кошык..." Якая ж тады можа быць ацэнка, калі нельга нічога сказаць крытычнага? Вось і застаўляеце нас выказваца „не зусім ясна". Хоць у канкрэтным выпадку мы выказаліся ясна: вы прасіліся ў „Белавежу", наш адказ быў: рана. Значыць, трэба ў яе прабіўацца праз „Парнасік", у які, згодна з яго дэвізам, кожнаму дарога адкрыта.

Маладыя, пачынаючыя аўтары! Калі хочаце нечага ў творчасці дабіцца, не бойцеся крытыкі. Яна — ваш саюзнік.

КІНО

ГАЙНАЎСКІ ПАВЕТ

Кляшчэлі
„Popierajcie swego szeryfa" (USA), 15—16. „Księżniczka Czardasza" (węg.), 17—18. „Sąsiedzi" (polski), 19—20.

Нараўка
„Lekcja odwagi" (czeski), „Śmierć Ipu" (rumuński), 16—20.

Нарва
„Przygody psa Cywila" (polski), „Milion lat przed naszą erą" (angl.), 16—20.

Чыжы
„Morderca na zawołanie" (NRD), „Przygody psa Cywila" (polski), 16—20.

Дубічы Царкоўныя
„Dzikie dziecko" (franc.), „Dawid Copperfield" (angl.), 16—20.

Арэшкава
„Ballada o Cable u Hugue u (USA), „Zdobywcy nieba" (radz.), 19—20.

БЕЛЬСКІ ПАВЕТ

Боцькі
„Zaraza" (polski), „Żandarm z gór" bułg.), 16—20.

Орля
„Trzy kobiety" (polski), „Ranny w lesie" (polski), 16—20.

Райск
„Trzecia część nocy" (polski), „Kochany drapieżnik" (radz.), 16—20.

САКОЛЬСКІ ПАВЕТ

Шудзялава
„12 krzeseł" (radz.), „Trup w każdej szafie" (czeski), 16—20.

Янаў
„Staroświecki dramat" (radz.), 16—20.

СЯМЯЦІЦКІ ПАВЕТ

Нурэц
„Nieznany" (polski), 15—16. „Dwaj panowie bez parasola" (rumuski), 17—18. „150 na godzinę" (polski), 19—20.

Мельнік
„Morderca na zawołanie" (NRD), 15—16. „Poławiacze gąbek" (radz.) 17—18. „Bez wyraźnych motywów" (franc.), 19—20.

Мілейчыцы
„Eroica" (polski, 15—16. „Śmierć na zakręcie" (NRD), 17—18. „Rewizja osobista" (polski), 19—20.

ДУБРОЎСКІ ПАВЕТ

Сухаволя
„Ktoś za drzwiami" (franc.), „Bez wyraźnych motywów" (franc.), 16—20.

Новы Двор
„Gniewna podróż" (jugosł.), „Czym mogę służyć" (czeski), 16—20.

Ніва

Organ Zarządu Głównego Białoruskiego Towarzystwa Społeczno-Kulturalnego. Wydawca: Białostockie Wydawnictwo Prasowe RSW „Prasa-Książka-Ruch". Redaguje Kolegium. Adres Redakcji: Białystok, ul. Wesołowskiego 1. Numer przy przesyłkach pocztowych: Redakcja tygodnika „Niwa", Skr. poczt. 281, 15-950 Białystok. Telefony: Redaktor Naczelny i Sekretarz Redakcji 2-10-33, publicyści 2-32-41 do 45 (centrala). Cena prenumeraty krajowej: rocznie: 28,80 zł., półrocznie: 14,40 zł, kwartalnie: 7,20 zł. Prenumeraty przyjmowane są do dnia 10 każdego miesiąca poprzedzającego okres prenumeraty. Prenumeraty na kraj dla czytelników indywidualnych przyjmują Urzędy Pocztowe oraz listonosze. Można również wpłaty na prenumeratę indywidualną dokonywać na konto I Oddziału Rejonowego „Ruch" w Białymstoku 150-6-161 NBP I OM Białystok. Na odwrocie blankietu należy podać okres prenumeraty i tytuł zamawianego pisma. Wszystkie instytucje państwowe i społeczne w miastach, zamawiają prenumeratę wyłącznie za pośrednictwem Oddziałów i Delegatur RSW „Prasa-Książka-Ruch". Pozostałe — mające siedzibę na wsi lub w innych miejscowościach, w których nie ma Oddziałów i Delegatur zamawiają prenumeratę za pośrednictwem Urzędów Pocztowych. Prenumeratę na zagranicę przyjmuje: RSW „Prasa-Książka-Ruch" Biuro Kolportażu Wydawnictw Zagranicznych, Wronia 23, 00-840 Warszawa. Konto PKO Nr 1-6-100024. Cena prenumeraty dla zagranicy jest wyższa od prenumeraty krajowej o 40%.

BZGraf. Nakład 8337 K-1

НЕПАРАЗУМЕННЕ

— Дык вось, бабулька, кранікі вашы цяпер у поўным парадку. Трымаюць вадзіцу як трэба. Слязінкі не пусціць! Усё зрабіў, што трэба, — сказаў слесар-сантэхнік домакіраўніцтва і іранічна паглядзеў на бабулю.

— Дзякуй, сынок, дзякуй...

— А што мне з гэтым вашым „дзякуй" рабіць? Мо ў кішэню яго пакласці? — спытаў сантэхнік і хлопнуў вечкам куфэрка з інструментам.

— Ага!.. Што ж гэта я?... Адну хвіліначку... — схамянулася бабулька і таропка выйшла з кухні. Твар сантэхніка расплыўся ва ўсмешцы.

— Вось вам на чай! — збянтэжана прамовіла бабулька і працягнула руку з манетамі на далоні.

— Ну што вы! Што вы! За каго мяне прымаеце?.. Няўжо цяпер яшчэ на чай даюць? — трэбліва зірнуўшы на манеты, загаварыў сантэхнік. — Не той час цяпер, не той жыццёвы ўзровень. Вы мяне проста пакрыўдзілі!..


— Даруйце, але мне падалося... я падумала...


— Думаць, вядома, трэба. Але як вы адсталі ад жыцця! Цяпер не на чай даюць, а на бутэльку...

Бабулька раскрыла рот, хацела нешта сказаць, але толькі паварушыла губамі.

— Ну добра, што зробіш, дарую вам. Вы маеце магчымасць папravіць памылку... І ўлічыце, што магазін гандлюе толькі да сямі...

А. Салаўянчык





— Вы што, не маглі раней да нумара падрыхтавацца?

ДОЎГІЯ НЕДАРОБКІ

— Рыгор, вы ўжо скончылі будаўніцтва малаказавода?

— Даўно, хутка год, як пабудавалі.


— А дзе ж цяпер працуеце?

— На малаказаводзе.

— Што, будаўнічую спецыяльнасць пакінулі?

— Не, дробныя недаробкі выпраўляем.

НІЎКА



Пра каханне і жылплошчу

Пакахаў Алёну Янка,
Сумаваў па любай ранкам,
Цэлы дзень да вечара
Ён хадзіў прыгнечаны.

А ўвечары над паркам
Зоры высыпалі ярка.
І Алёну любую
Янка прыгалубліваў.

Нават не прыкмеціў,
Як з'явіўся трэці,
На Алёну глянуў
І сказаў Івану:


— Кінь свае любошчы,
Дзе твая жылплошча?
А ў мяне пакой
У доме над ракой.

След прастыў ягоны,
З ім пайшла Алёна...
Сеў тады з журбой
Янка пад вярбой...

Ёсць Алёны, Веры,
Соні, Любы, Тані,
Для якіх кватэра
Даражэй кахання.


Рыгор Яўсееў

Галаваломка




Які з васьмі пранумераваных кубікаў поўнасцю адпавядае разгорнутаму кубіку?

Адказ на заданне з папярэдняга нумара: Трэба ўзяць чацвёртую шклянку злева (поўную), выліць ваду ў першую шклянку злева і паставіць яе на старое месца.



— Ён упарта хацеў знайсці няспраўнасць, але аказалася, што проста быў закрыты кран...



...Аўтар скаргі пытаў: «Што такое бюракратызм?» Яму не адказалі. Ён зразумеў.

...Каб не быў ён славутым, з яго мог бы выйсці толк.

КОЛЬКІ

Амерыканскі ўрач у прысутнасці сваіх знаёмых гаворыць:

— За наведванне хворага дома я бяру пяцьдзесят долараў, а за прыём у кабінеце — сорак, за кансультацыю па тэлефоне — пяцьдзесят і за выпіску рэцэпта дзесяць.

— Даруйце, — гаворыць адзін са знаёмых, — а колькі вы бярэце з пацыента, калі ён у вашай прысутнасці прымае аспірын?

МІНІБАЙКІ

ВАРЫЯЦЫІ НА ТЭМУ: МУХА І СЛОН

1.

Прыходзіць Муха ў аддзел кадраў і гаворыць:

— У мяне ёсць хабаток, знайдзіце яму занятак.

— Добра — будзеце цягаць калоды.

Дзень праходзіць, месяц праходзіць. Муха не цягне. Вырашылі яе маральна падтрымаць. Усё роўна не цягне. Матэрыяльна зацікавіць. Не цягне... Вынеслі вымову. Не цягне! Звольнілі. Аднавілі па суду... І зноў не цягне.

Мараль — не рабіце з мухі слана.

2.

Выклікалі аднаго маладога вясёлага слана і гавораць:

— Ай-ай-ай!.. Як ты сябе вядзеш? Тупаеш, трубіш на ўвесь хобат...

Слон паслухаўся старэйшых, стаў цішэй вады, ніжэй травы. Але засумаваў.

А павук тут як тут:

— Шпар да мяне ў павуціну. Там можна і твіст згуляць, і халі-галі адтупаць.

Слон спакусіўся і ўліп...

Скажаце, Слон не можа трапіць у павуціну?

А вы не рабіце з слана мухі!

М. Азаў, У. Цiхвінскі

ПЕСНІ ПА ЗАЯЎКАХ

Па просьбе Веры Паповай з Беластока з найлепшымі пажаданнямі змяшчаем песню

BALLADA O BARWACH

**Pierwszy rudy był jak rydz w zieleni traw,
jakby jesień użyczyła mu swych barw.
Tuląc synka matka śmiała się do łez:
Mój rydzyku, moje słonko, co ci jest?**

**Drugi czarny był tak zrządzi ślepy los,
Oczy ciemne miał, a włosy niby noc.
Matka śmiejąc się gładziła jego skroń:
Widać nocą mi się przyśnił kary koń.**

**Gdy zerwała się do lotu wojny pieśń,
megafony wychrypiały trwożną wieść,
pokłonili się synowie matce w pas:
Żegnaj, mamo! Idzie wojna...
W drogę czas!**

**Poszedł pierwszy i ten drugi poszedł syn,
tam, gdzie hulał rudy ogień, czarny dym.
Przez wyblakłą zieleń frontów szli na bój
i poznali lazaretów krwawy znój.**

**Już dopala się zbutwiały wojny pień,
Matka wierzy, matka czeka na ten dzień,
gdy synowie znów przekroczą domu próg —
i ten rudy, i ten czarny niby kruk.**

**Co za radość, co za szczęście dał jej los,
chociaż matki w całej wiosce płaczą w głos,
ona jedna doczekała tego dnia...
Oto znowu w swoim domu synów ma.**

**Cali, zdrowi powrócili w domu próg,
ani rąk im nie brakuje, ani nóg.
Czegóż więcej matce trzeba: w domu są,
a na bluzach im ordery złotem lśnią.**

**Usiadł rudy i ten czarny niby noc.
Patrzy matka — i załamał jej się głos:
obaj siwi... jak gołąbki siedzą dwa.
Widać wojna pod dostatkiem bieli ma.**

РАЗАМ

У кухні Ольсенаў узарваўся балон з газам, і Ольсен разам з жонкай, быццам ракеты, вылецелі адначасова скрозь дах. Суседзі здзівіліся:

— Падумаць толькі! За трыццаць год муж і жонка ўпершыню разам выйшлі з дома...

ГУМАР З

ВЫКРУЦІЎСЯ

Убачыўшы свайго мужа п'яным, Ядвоха пачакала, пакуль ён зойдзе ў хату, і накінулася:

— Ты зноў ледзь трымаешся на нагах. Дакуль я буду цярпець! ...Хіба ж гэта жыццё! Ды самой у сто разоў лепш быць! — пачала выбіраць са скрыні свае рэчы.

Кастусь, бачачы, што непаралі ўкі, падступіў да яе бліжэй.

— Абяцаю больш не піць да смерці.

На гэтым і памірыліся. А ў наступную нядзелю зноў Кастусь прыйшоў падпіты.

— Вось якія твае абяцанкі... Вось якія... Ты ж казаў, што да смерці не будзеш піць! — пачала жонка.

— Жонка! Ды ці ж я я да смерці п'ю! Я ж да кума, да Андрэя п'ю, — адказаў муж.



— Гэта макет для працўніка. Я жыву тут.

КУРʼЁЗЫ

МОСТ... З ЛІЯН

Разнастайнае выкарыстанне знаходзяць афрыканцы ліянам, якімі багаты трапічныя лясы Афрыкі. З валокнаў ліяны робяць тканіны і вяроўкі, яе прымяняюць для прыгатавання піва і брагі, для выпечкі хлеба, а таксама ў медыцыне і... мостабудаванні.

У Беразе Слановай Косці пабудавалі самы доўгі ў Афрыцы мост з ліян. Яго даўжыня складае каля 100 метраў, а грузападымальнасць — 50 тон.

І ТАКОЕ БЫВАЕ

Для ўдзельнікаў І Алімпійскіх гульняў у каралеўскім палацы ў Афінах быў наладжаны прыём. Віншуючы алімпійскіх пераможцаў, кароль Грэцыі звярнуўся да 18-гадовага венгерскага плыўца Альфрэда Хайаша, удастоенага двух залатых медалёў:

— Дзе вы навучыліся так добра плаваць?

—У вадзе, ваша вялікасць, — пачуўся адказ.

ВЕЛЬМІ РЭДКІ ВЫПАДАК

У Джын Скот, жыхаркі англійскага горада Брэдфарда нарадзілася трэцяе дзіця. Гэта было 4 сакавіка. Сваіх першых дваіх дзяцей у папярэднія гады Джын Скот нарадзіла таксама 4 сакавіка. У адказ на запраграмаванае пытанне ўрачоў радзільнага дома камп'ютэр паведаміў, што выпадак супадзення дзён нараджэння траіх дзяцей у адной маці бывае адзін раз на 48 мільёнаў родаў.

І ТАКОЕ БЫВАЕ

„Старайцеся карыстацца таксі фірмы „Іэлоў кэб", якая кантралюецца палцыяй: сеўшы ў іншую машыну, вы рызыкуеце тым, што вас завязуць на ўскраіну, аграбяць і выкінуць" (з паліцыйнага інфарматара ў ЗША).

Смяюцца з намі

Калісь сябры сустракаліся, каб пагаварыць. Цяпер яны збіраюцца, каб памаўчаць. Ля тэлевізара.

© PDF: Kamunikat.org 2023